СОНЦА:
Усход, заход, даўжыня дня
Мінск — 6.36, 19.35, 12.59;
Віцебск — 6.25, 19.27, 13.02;
Магілёў — 6.25, 19.24, 12.59;
Гомель — 6.26, 19.18, 12.52;
Гродна — 6.53, 19.48, 12.55;
Брэст — 6.54, 19.49, 12.55

МЕСЯЦ:
Поўня 12 верасня

ІМЯНІНЫ:
Аляксандра, Івана, Паўла, Данілы.

ЗВЯЗДА

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1 рубель

12 ВЕРАСНЯ 1992 г. субота, № 184 (21962)

РОЗГАЛАС

«ПАВЫСІЎШЫ ЦЭНЫ НА ЭНЕРГАНОСЬБІТЫ, РАСІЯ ПАРУШЫЦЬ МІЖУРАДАВАЕ ПАГАДНЕННЕ З БЕЛАРУССЮ»

Тэлебачанне ўчора данесла да нас вестку з Масквы аб тым, што ўрад Расіі прыняў рашэнне адпусціць цэны на энерганосьбіты. Важнасць гэтай падзеі немагчыма недаацаніць, тым больш, што адразу пайшлі розныя чуткі. Пракаменціраваць гэтую сітуацыю мы папрасілі кіруючых работнікаў галоўнага ўпраўлення цэн Дзяржэканомплана Беларусі. Аднак ні начальнік упраўлення Уладзімір Міхасёў, ні яго намеснік Аляксандр Грэцкі нічога канкрэтнага сказаць не маглі, бо няма яшчэ пра гэта ніякай афіцыяльнай інфармацыі.

Тым часам група работнікаў Дзяржэканомплана Беларусі знаходзіцца зараз у Маскве, дзе якраз і ідзе прапрацоўка пагаднення з Расіяй аб цэнах на энерганосьбіты на 1993 год. Пакуль што мы працягваем плаціць 2.815 рублёў за тону нафты, але нават калі яе кошт узнімецца да 4.000, то і тады ў нашай рэспубліцы, як сказаў А. Грэцкі, можна будзе абысціся без новага павышэння цэн на прадукты харчавання і прамысловыя тавары. Але павышэнне закупачнай цаны на нафту да 6 тысяч, 12 тысяч рублёў ці ўстанаўленне свабоднай к канцу 1993 года, як мяркуецца, пацягне за сабой і рост цэн на народнагаспадарчыя тавары да 50 працэнтаў. Між тым мае законную сілу міжурадавае беларуска-расійскае пагадненне, падпісанае пядаўна В. Кебічам і Я. Гайдарам, а таму без узгаднення з нашай краінай, як сказаў У. Міхасёў, Расія не можа адпусціць цану на энерганосьбіты.

У ПРЭЗІДЫУМЕ САВЕТА МІНІСТРАЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

БУДЗЕ АДЗІНЫ ПАШПАРТ

Пад старшынствам В. Ф. Кебіча ў Доме ўрада адбылося чарговае пасяджэнне Прэзідыума Савета Міністраў Беларусі. З дакладам аб праекце Закона «Аб парадку выезду з Рэспублікі Беларусь і ўезду ў Рэспубліку Беларусь грамадзян Рэспублікі Беларусь» на ім выступіў міністр унутраных спраў В. Д. Ягораў. Галоўная сутнасць гэтага дакумента выражана ўжо ў яго першым артыкуле: «Кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь мае права выязджаць з Рэспублікі Беларусь і ўязджаць у Рэспубліку Беларусь. Грамадзянін Рэспублікі Беларусь не можа быць пазбаўлены права на ўезд у Рэспубліку Беларусь». Значную цікавасць выклікае закладзеная ў законапраекце канцэпцыя адзінага пашпарта грамадзяніна Беларусі. Пашпарт будзе функцыяніраваць на тэрыторыі рэспублікі, а таксама служыць дакументам, які дае права на выезд за мяжу. З нязначнымі заўвагамі і папраўкамі праект быў адобраны.

На пасяджэнні разглядаліся пытанні аб спісанні запазычанасці па доўгатэрміновых крэдытах і стратах ад канверсіі, аб унясенні змяненняў у дзяржаўны бюджэт 1992 года, прыняты адпаведныя пастановы.

АХВЯРЫ НЕ ЗАБЫТЫ

ГРОДНА. Непадалёк ад райцэнтра Зэльва ў лясным урочышчы Амельнае адкрыты помнік ахвярам сталінізму.

У верасні 1939 года тут былі расстраляны каталіцкія святчэннаслужыцелі і пахаваны ў адной магіле. Сярод расстраляных быў ксёндз Ян Крымскі, протаіерэй Давід Якубсан, камергер папы рымскага Аскар Мейстовіч.

Помнік пабудаваны на сродкі раённага аддзялення Саюза палякаў Беларусі.

АБ ВІЗІЦЕ СТАНІСЛАВА ШУШКЕВІЧА Ў ФРГ

14 верасня пачнецца візіт Старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслава Шушкевіча ў Федэратыўную Рэспубліку Германіі. Запланаваны шэраг сустрэч і палітычных кансультацый з кіраўніцтвам нямецкай дзяржавы па пытаннях, якія маюць узаемны інтарэс.

Дыяпазон перагавораў з палітычнымі лідэрамі Германіі значны. Плануецца абмеркаваць пытанні пашырэння супрацоўніцтва Беларусі і Германіі, насычэння новым зместам праграм узаемадзеяння ў галіне аховы інвестыцый, культуры, навукі, адукацыі, медыцыны, камунікацый і інш. Абодва бакі прааналізуюць магчымасць хутчэйшага адкрыцця ў ФРГ Пасольства Рэспублікі Беларусь.

У час знаходжання ў Германіі кіраўнік парламента Беларусі прыме таксама ўдзел у міжнародным кангрэсе «Еўропа і свет у пераломны момант: забеспячэнне канкурэнцыі эканамічных рэгіёнаў ва ўсім свеце». Арганізатары кангрэса ставяць сваёй мэтай аб'яднаць намаганні вышэйшых сфер палітыкі, прадпрымальніцтва і навукі ў пераадоленні цяжкасцей, якія паўсталі на шляху развіцця сучаснай цывілізацыі.

Чакаецца выступленне Станіслава Шушкевіча з дакладам па праблемах развіцця суверэннай Беларусі, актывізацыі ўключэння рэспублікі ў еўрапейскую эканамічную інтэграцыю.

Прэс-служба Вярхоўнага Савета — БЕЛІНФАРМ.

Інфармацыя для роздуму:

БЕСПРАЦОЎЕ

За 7 месяцаў бягучага года ў цэнтр занятасці Рэспублікі Беларусь звярнуліся 106,7 тысячы чалавек, з якіх 46,5 тысячы былі працаўладкаваны. Беспрацоўнымі за гэты перыяд прызнаны 12.710 чалавек, а ўсяго на ўліку на 1 жніўня гэтага года 9.282 беспрацоўныя. На перанавучанне накіраваны 1.630, на грамадскія работы — 8.747 чалавек.

БЕЛАРУСЬ ХУТЧЭЙ ЗА ЎСЁ ЗАКРЫЕ ПРАБЛЕМУ З ХЛЕБАМ

Гэта ўпэўненасць з'явілася ў намесніка міністра абароны РБ генерал-палкоўніка Пятра Чауса пасля паездкі ў Кустанайскую вобласць, дзе працуюць на ўборцы ўраджаю ваенныя і цывільныя падраздзяленні з Беларусі. Прэзідэнт Казахстана Нурсултан Назарбаеў ужо выдаў ліцэнзію на продаж Беларусі 2 мільёнаў тон збожжа. Па якіх цэнах яно будзе нам прадавацца, невядома. Гэта залежыць ад рыначнага курсу і ад таго, як мы там папрацуем.

Пакуль што, ва ўсялякім разе, казахскі бок задаволены нашымі «валанцёрамі», якія працуюць у Кустанайскай вобласці.

Ад Міністэрства абароны там працуе больш чым паўтары тысячы чалавек плюс 800 грузавых аўтамашын. З цывільных — 1.200 аўтамашын плюс 150 камбайнераў плюс абслуговы персанал.

Камбайнеры атрымліваюць па 30 тысяч рублёў у месяц, вадзіцелі — па 20 тысяч. Пры гэтым на казахскіх дарогах не знойдзеш рассыпанага збожжа і ўвогуле страты яго значна меншыя ў параўнанні з іншымі рэспублікамі Садружнасці. Кожнаму камбайнеру і вадзіцелю выдаецца 10 талонаў якасці. Спецыяльная камісія кантралюе час ад часу работу кожнага і, калі выяўляе значныя недахопы, — забірае талоны. Так, у канцы месяца можна застацца ўвогуле без заработнай платы.

Нашы «валанцёры» таксама на талоннай сістэме, але пракалаў з нашага боку няшмат. Ёсць толькі выпадкі, калі тэхніка ламаецца ад занадта напружанага рэжыму працы. Узаемаадносіны з казахскімі кіраўнікамі гаспадарак, на тэрыторыі якіх працуюць пасланцы Беларусі, вельмі добрыя. Нам гатовы прадаць нават бульбу па 8—10 тысяч рублёў за тону.

Аб абяцаных дзвюх тонах кожнаму байцу за ўраджай: столькі не атрымаецца, але паўтоны ці тону кожны камбайнер і вадзіцель усё ж дамоў павязуць. Што засмучае ў «казахскай» кампаніі, дык гэта поўная адасобленасць ваенных і цывільных пасланцоў рэспублікі. Нейкага аператыўнага штаба беларускага кантынгенту ў Казахстане няма.

Можа таму і загінула ўжо 6 беларусаў у гэтай сярэднеазіяцкай рэспубліцы. Адзін з іх павесіўся, астатнія амаль усе знайшлі смерць ад алкагольнага атручэння. І гэта наводзіць на сумныя думкі.

Цяпер там вельмі ўдарны час, і пры ясным надвор'і ўсю ўборку плануюць закончыць да сярэдзіны кастрычніка.

Чаго баяцца ў Казахстане, дык гэта яшчэ больш небяспечнага развіцця падзей на таджыкска-афганскай граніцы, адкуль рассейваюцца па Сярэдняй Азіі баевікі. Спадзявацца ў данай сітуацыі застаецца толькі на падтрымку Расіі ва ўмацаванні таджыкскай граніцы.

Аляксандр КОКТЫШ.

ПРЫВАТЫЗАЦЫЯ ПАЎЗЕ ЧАРАПАХАЙ

У снежні 1991 года Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь прыняў праграму прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці на 1992 год, згодна з якой была прадугледжана прыватызацыя 147 аб'ектаў рэспубліканскай маёмасці, у тым ліку —86 прадпрыемстваў. Аднак па стану на 1 ліпеня 1992 года з гэтага спісу прыватызавана толькі 10 прадпрыемстваў (прыкладна кожнае дзевятае з уключаных у вышэйназваную праграму на першае паўгоддзе). Такім чынам, тэмпы прыватызацыі ў рэспубліцы — чарапашыя.

«ГЭТА БЫЛО ЗВЫЧАЙНАЕ ХУЛІГАНСТВА...»

Надзвычайнае здарэнне, якое адбылося ў ноч з 8-га на 9-е верасня,— знявага, нанесеная нацыянальнаму сцягу і гербу,— узбударажыла многіх грамадзян рэспублікі. Мінчанін Аляксандр Яўсеевіч Дайнека, які патэлефанаваў у рэдакцыю, сказаў, што гэтым учынкам растаптаны гонар і годнасць Беларусі і беларусаў.

А што ж нашы праваахоўныя органы? Для начальніка следчага аддзела мінскай гарадской пракуратуры Уладзіміра Колатава наша тэлефоннае паведамленне аб тым, што адбылося, наогул было адкрыццём, таму ён заявіў, што нічога не будзе каменціраваць. Само ж здарэнне Уладзімір Віктаравіч ацаніў не больш як «хуліганскі ўчынак».

Цяжка было высветліць нешта і ва ўпраўленні ўнутраных спраў Мінгарвыканкома. Намеснік начальніка аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі Віктар Кліменка таксама, як аказалася, «не быў паінфармаваны». Пасля некалькіх хвілін удакладнення ён параіў пазваніць начальніку міліцыі Маскоўскага раёна сталіцы Аляксандру Шчурко. Аляксандр Сямёнавіч спаслаўся на занятасць...

Хочаш — не хочаш, але пасля ўсяго гэтага складваецца ўражанне, што быццам бы нічога экстраардынарнага і не адбылося: у Мінску ўсё спакойна, звычайны хуліганскі ўчынак. Яўнай палітычнай афарбоўкі ўчынку нашы праваахоўнікі бачыць не хочуць.

Анатоль СЛАНЕЎСКІ.

АСЦЯРОЖНА — ДЗЕЦІ

ГРОДНА. За апошні час у вобласці значна павялічылася колькасць дарожна-транспартных здарэнняў з удзелам дзяцей. З пачатку года на Гродзеншчыне ў выніку гэтых здарэнняў 12 дзяцей загінулі і 144 паранены і пакалечаны, што больш, чым за адпаведны перыяд мінулага года.

Як у вёсачцы Кулі завяліся куркулі

З фермерамі Філіповічамі я сустрэўся ў сярэдзіне жніўня. Гаспадары шчыра расказалі пра сябе, сваю гаспадарку, паказалі сялібу, дом. Доўга працягвалася размова. А вось апісаць не я пэўны час ніяк не мог — успамінаў парэзаныя маршчынамі твары маіх субяседнікаў, іх вузлаватыя, счарнелыя, у буграх мазалёў рукі, смутак у вачах, і неяк не знаходзілася слоў, каб выказаць свае ўражанні...

МІХАІЛ СЯРГЕЕВІЧ І МАРЫЯ МІХАЙЛАЎНА прыехалі ў вёску Куль недзе дзесяць гадоў назад з горада. Міхаіл Сяргеевіч тады хварэў, атрымаў другую групу інваліднасці. Вось і вырашылі перасяхаць у бацькоўскі дом Марыі Міхайлаўны, які пуставаў. Зрабілі сякі-такі рамонт з дапамогай сыноў, пайшлі працаваць аглядчыкамі меліярацыйных сістэм. Абкошвалі каналы, чысцілі і ўмацоўвалі сценкі канаў, наглядалі за шлюзамі. За лета назапашвалі нямала сена, потым яго прадавалі. Невялікія грошы, а ўсё ж прыбытак.

А потым родзічы параілі купіць цялушку, свінчо якое — як жа без жыўнасці ў сялянскім двары? Так пачыналі. Цялушка стала добрай каровай, прынесла прыплод. Пачаў расці малочны статак Філіповічаў.

Быў у той час у іх і прысядзібны ўчастак у паўгектара, сад. Але вось толькі зямлёй сельсавет не дазваляў карыстацца, маўляў, вы гараджане, не маеце такога права. Затое былы сельсавецкі старшыня Хрэшчык прымушаў палоць той закінуты агарод, каб, значыць, не рассейвалася пустазелле. Вось дзе сапраўды ідыятызм вясковага жыцця: зямлёю карыстацца «не маглі», але пустазелле з яе выдаляй.

Як бы там ні было, з цягам часу гаспадарка Філіповічаў мацнела. На падвор'і з'явілася больш дзесятка кароў, бычкоў, свіней. Пайшла і прадукцыя — мяса, малако. За дзесяць гадоў фермеры прадалі ў мясцовы калгас і нарыхтоўчую кантору больш за 25 галоў жывёлы на мяса, звыш 100 тон малака. Гэта пры тым, што і сабе хапала, і дзецям дапамагалі.

Была задумка купіць уласную машыну, тым больш, што нарыхтоўчая кантора аб'явіла конкурс: хто больш прадасць мяса, той і набудзе «жыгуль» без усялякай чаргі. Сталі пераможцамі конкурсу, але машыны так і не дачакаліся — то, аказваецца, не прапісаны ў раёне, то яшчэ якія адгаворкі знаходзіліся. Біўся-біўся Міхаіл Сяргеевіч з мясцовымі бюракратамі, ды і плюнуў. Купіў мотаблок з прычэпам і наборам прылад, каб хоць крыху сваю працу аблегчыць. Сын прыцягнуў аднекуль дзве ламачыны — «Масквічы» першых гадоў выпуску, сабраў з іх нешта падобнае на машыну — сяды-тады можна на ёй некуды і паехаць.

Праўда, ранейшы старшыня калгаса У. Шарко дапамагаў фермерам чым мог — абы толькі прадукцыю давалі. І справа тут, уласна кажучы, не толькі ў душэўных якасцях Уладзіміра Рыгоравіча — ён бачыў, што такое супрацоўніцтва выгадней і калгасу, і фермерам. Ды і Міхаіл Сяргеевіч ішоў насустрач — даў згоду працаваць калгасным пастухом, тры гады прапрацаваў на гэтай неспакойнай пасадзе.

Зараз часы змяніліся, і Філіповічам далі дазвол апрацоўваць бацькоўскі надзел. Але хіба можна на 50 сотках нарыхтаваць корму для статка ў паўтара—два дзесяткі галоў? І фермеры вымушаны шукаць дадатковыя крыніцы кармоў. У прыватнасці, яны разам з іншымі аднавяскоўцамі лётась пасля ўборкі калгаснай бульбы сталі збіраць тое, што засталося на полі. Міхаіл Сяргеевіч назбіраў 5 мяшкоў клубняў. Вось тут яго і «накрылі» калгасныя спецыялісты. Бульбу забралі, а справу перадалі ў міліцыю. Ды не ўдалася «справа» — сын зрабіў здымак, на якім відаць, як бацька выкалупваў клубні з мёрзлых глыб. Іншых жа падборшчыкаў не кранулі. Вось такая псіхалогія — няхай лепш згніе, змарнее дабро — абы не дасталося чужынцу-«кулаку».

Гэтага чамусьці не бачаць вяскоўцы. Яны бачаць толькі суму ў ведамасці за здадзеную прадукцыю. І многіх грызе зайздрасць, ды такая пякучая, што спрабавалі нават падпаліць селішча фермера. А адзін з суседзяў нават нагадзіў у калодзеж, дзе Філіповічы бралі ваду. Прыйшлося тым здабываць і ўстанаўліваць калонку ва ўласным агародзе. 10 сутак, праўда, зламыснік атрымаў, але больш сумленным ад гэтага не стаў.

Непрыгожа атрымалася і з пашай для жывёлы фермераў. Філіповічы дамовіліся з калгасам аб выдзяленні пашы. Участак выдзелілі, гаспадар яго абгарадзіў. Але на трэці дзень прыбыў кормаўборачны камбайн з мехдвара і ўвесь травастой скасіў. І гэта яшчэ не ўсё — калгас падаў на Філіповічаў у суд нібыта за патраву калгаснай сенажаці. Далей — болей. Старшыня калгаса Я. Федчанка даў каманду малаказборшчыку не прымаць у фермераў малако. Горкімі слязьмі аблівалася Марыя Міхайлаўна, але каб не сапсаваць кароў, даіла іх прама на зямлю, у гной. А ўся справа ў тым, што нехта з дабрахотаў увёў у вушы старшыні, што Філіповічы дабаўляюць у сырадой парашковае малако. Ну, якая тут можа быць логіка — сваё малако выдойваецца на зямлю, а парашковае ідзе ў справу. Ды і дзе ў той закінутай вёсачцы набярэшся таго парашку?

Пра гэтыя незаслужаныя крыўды даведаліся журналісты рэспубліканскага тэлебачання, а Філіповічы ў адчаі звярнуліся ў пракуратуру вобласці. І справа зрушылася з месца — малако пачалі ў Філіповічаў прымаць. Але паваладзілі добра — месяц прымаюць, другі — не. Так вось і прапала каля трох тон малака.

Але няма ніякай упэўненасці ў фермераў, што не паўторыцца ранейшая сітуацыя, калі кармы ім не дазволілі нарыхтаваць і жывёла ледзь-ледзь выйшла на вясну. Ды і не ўся яна, дарэчы, выйшла — ад бяскорміцы пала лепшая карова, якая давала па 30 і больш літраў малака ў дзень.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

УРАГАН

Страты на дзесяткі мільёнаў рублёў прынёс Валожынскаму раёну небывалай магутнасці ўраган. Пацярпеўшым тут тэрмінова аказана дапамога. Ахвяр не было, але падворкі многіх вяскоўцаў выглядаюць як пасля магутнага землетрасення. З дапамогай мясцовых будаўнікоў, вайскоўцаў, насельніцтва арганізавана вядуцца аднаўленчыя работы.

Яўген ПІСЕЦКІ.

На здымках: трыццаць гадоў пражылі ў сваёй вёсцы Яўгенія Іванаўна і Станіслаў Іосіфавіч Клімовічы і не могуць прыгадаць такіх разбуральных вятроў; тут праляцеў ураган; у калгасніка Сяргея Іосіфавіча Качынскага стыхія пашкодзіла хату і надворныя пабудовы.

«ЗВЯЗДА»-93

Шчасце не ў грошах, а ў іх колькасці...

Чытаць казкі — для дарослых людзей, вядома ж, не салідна, ды і не моднае сёння такое чытанне. І ўсё ж мушу задацца пытаннем: у чым сэнс многіх беларускіх казак і твораў іншых народаў свету? У тым, што казачны герой пасля шматлікіх прыгод абавязкова здабывае свой кавалак золата ці вялікія грошы, або жаніўся на царскай дачцэ (што зноў жа з'яўлялася сінонімам шчаслівага і багатага жыцця). Вось у чым шматвяковая мара незаможнага люду — і ў гэтым уся праўда.

Аднак практычна ўсе семдзесят з лішкам гадоў існавання ва ўмовах сацыялістычнай фармацыі (ці пры тым ладзе, які пад гэтым тэрмінам меўся на ўвазе) нас прывучалі да штучнай думкі, якая супярэчыць самой сутнасці чалавека: жыць добра і багата — гэта дрэнна. Так і не дабіліся выканання асноўнага пастулата сацыялізму: ад кожнага — па здольнасцях, кожнаму—па працы. Адпаведна члены нашага грамадства і працавалі, а вечарамі ў цесных сяброўскіх застоллях прыдумвалі пра нашу былую рэчаіснасць з'едлівыя анекдоты і афарызмы — накшталт прыведзенага ў загалоўку. Можна прывесці нямала і іншых выразаў — наколькі злых, настолькі і трапных: лепш быць багатым і здаровым, чым бедным і хворым; лепш жыць стоячы, чым памерці на каленях і інш. Якім яшчэ мог быць фальклор пры адсутнасці палітычных, эканамічных і іншых свабод?

І толькі цяпер у грамадстве пачалі складвацца ўмовы для вольнай самадзейнасці свабоднага чалавека, асабіста зацікаўленага ў выніках сваёй працы. А гэта ў шырокім сэнсе і завецца прадпрымальніцтвам, якое з'яўляецца натуральным станам разняволенай, свабоднай асобы. Іменна з такога пункту гледжання газета разглядала ў апошні час адпаведныя з'явы ў жыцці грамадства, развіцці рынку, новых эканамічных адносін. Менавіта такую нагрузку неслі газетныя рубрыкі: «Рынак як ён ёсць», «Школа гаспадарання», «Свая справа» і іншыя. Будзем, аднак, шчырымі і самакрытычнымі, а таму скажам: яшчэ не на ўсе надзённыя пытанні ў гэтым плане чытачы змаглі атрымаць адказ. Напрыклад: якім чынам і спосабам простаму працаўніку сёння зарабляць так, каб, не думаючы пра жураўля ў небе, мець у руках хоць бы сініцу? Тут якраз і акрэсліваецца вялікае поле работы для журналістаў.

...Усё ж вельмі не хочацца цешыць сябе ружовымі спадзяваннямі на светлае капіталістычнае заўтра, захапляцца казачкамі аб чароўных магчымасцях нашага цяперашняга «дзікага» рынку. Пакуль што, адкінуўшы фантазіі, аўтар, як і многія чытачы, не бачыць сябе ўладальнікам прэстыжнага «мерседэса» ці шыкоўнага офіса. Ёсць клопат больш важны — як выжыць і пракарміць сям'ю. Дзе знайсці фінансавыя рэзервы тым жа пенсіянерам і інвалідам? На які бізнес ім разлічваць? Адпаведныя ідэі, між тым, ёсць, іх з дапамогай свядомых людзей і падкажа газета.

Тут дарэчы будзе напомніць: наперадзе — прыватызацыя дзяржаўнай уласнасці, калі кожны атрымае адпаведны чэк. Каб не памыліцца, правільна распарадзіцца ім, трэба ведаць, якой арганізацыі ці фірме можна давяраць. Мы дапаможам вырашыць гэту праблему, будзем змяшчаць інфармацыю аб розных рыначных структурах пад назвай «Бізнесрэйцінг: хто ёсць хто».

Як не забывала «Звязда» раней пра тых, хто адкрыў у сабе прадпрымальніцкую жылку, стаў на шлях актыўнага бізнесу, так і надалей будзе іх прадстаўляць. Як з большай выгадай весці ўласную справу, да каго са знаўцаў бізнесу звярнуцца, дзе і што можна купіць-прадаць — пра ўсё гэта будуць расказваць публікацыі пад рубрыкамі: «Бізнес-клуб», «Лекцыйная зала», «Біржавая хроніка».

Не адкрыем вялікага сакрэту, калі скажам: сапраўдны дзелавы чалавек проста не можа не трымаць, вобразна кажучы, нос па ветру, не цікавіцца эканамічнай палітыкай урадавых і заканадаўчых структур, дзейнасцю незалежных прадпрымальніцкіх арганізацый. Газета і надалей будзе ўводзіць бізнесменаў у курс спраў.

Можа здасца банальнасцю, але паўторымся: «лішнія» грошы яшчэ нікому не шкодзілі. Думаецца, дарэчы тут некалькі зменены ўсім вядомы выраз Казьмы Пруткова: хочаш быць багатым — будзь ім. А паколькі на гэтую праблему ў кожнага свой погляд, то прапануем: давайце раіцца. Газета прадастаўляе свае старонкі самым розным прапановам, думкам і меркаванням. Шчыра жадаем, каб «Звязда» стала ў гэтым плане ўсеагульнай школай узаемнага навучання.

Валерый ЧАРНЯЎСКІ, агладальнік рэдакцыі газеты «Звязда».

ДА ЎВАГІ ПАДПІСЧЫКАЎ!

З 1 студзеня 1993 года наша газета будзе рэгулярна друкаваць купон для змяшчэння бясплатных прыватных аб'яў. Тыя, хто сёлета падпішацца на «Звязду», будуць мець магчымасць без лішняга клопату вырашыць многія асабістыя праблемы.

Выпісвайце «Звязду» — адзіную штодзённую беларускамоўную газету!

Ф. СП-1

Міністэрства сувязі і інфарматыкі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **63850** (індэкс выдання)

«ЗВЯЗДА» Колькасць камплектаў

на 1993 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ____ (паштовы індэкс) ____ (адрас)

Каму ____ (прозвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА

ПВ | месца | літар

на газету **63850** (індэкс выдання)

«ЗВЯЗДА»

Кошт	падпіскі	___руб.___кап.	Колькасць камплектаў	
	пераадрасоўкі	___руб.___кап.		

на 1993 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Куды ____ (паштовы індэкс) ____ (адрас)

Каму ____ (прозвішча, ініцыялы)

ВАМ АДКАЗВАЕ ЮРЫСТ

Хочаце стаць мільянерам? Калі ласка!

У наш час жыць цяжка. Вось я працую і на асноўным месцы работы, і па сумяшчальніцтву. Але ж усё роўна грошай не хапае. Пражыць сям'ёй з чатырох чалавек на мае даходы практычна немагчыма. А жыць хочацца добра. Нядрэнна было б стаць і мільянерам, каб не лічыць кожную капейку. Я мог бы ўзяць заказы на пашыў абутку. Умею рабіць і многае іншае. Калі я пачну працаваць па індывідуальных заказах, ці не будзе мая дзейнасць супрацьзаконнай?

М. Л.

г. Магілёў.

У адрозненне ад недалёкага мінулага зараз даходы грамадзян у Беларусі не абмяжоўваюцца. Кожны мае права зарабіць, колькі ён здольны. Прычым (за невялікімі выключэннямі, якія датычаць работнікаў дзяржаўных органаў) не забаронена працаваць па найму ў арганізацыях, установах, на прадпрыемствах, у тым ліку і па сумяшчальніцтву і, акрамя таго, займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю. Як відаць з ліста, менавіта такая дзейнасць прываблівае яго аўтара, бо згодна з артыкулам 1 Закона Рэспублікі Беларусь, аб прадпрымальніцтве ў РБ, самастойная ініцыятыўная дзейнасць, накіраваная на атрыманне прыбытку або асабістага даходу, якая ажыццяўляецца ад свайго імя, на сваю рызыку і пад сваю маёмасную адказнасць, і ёсць дзейнасць прадпрымальніцкая. Але, каб быць законнай, яна павінна адпавядаць некаторым умовам, устаноўленым заканадаўствам.

Па-першае, прадпрымальнік павінен прайсці дзяржаўную рэгістрацыю. З ліста з Магілёва бачна, што аўтар мае намер займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю без утварэння юрыдычнай асобы. Рэгістрацыя такіх прадпрымальнікаў праводзіцца па месцы іх жыхарства выканаўчымі камітэтамі раённых, гарадскіх, раённых у гарадах Саветаў народных дэпутатаў. Калі гэта ўмова не будзе вытрымана, то прадпрымальнік падлягае адміністрацыйнай адказнасці. З яго можа быць спагнаны штраф у размеры ад 500 да 3.000 рублёў (артыкул 12 Закона Рэспублікі Беларусь аб падатках і зборах, якія ідуць у бюджэт рэспублікі).

Па-другое, прадпрымальнік мае права займацца толькі такой дзейнасцю, якая не забаронена заканадаўствам. Калі ж ён займаецца такімі відамі дзейнасці, для якіх патрабуецца спецыяльны дазвол (ліцэнзія), то павінен мець адпаведны дакумент. Пералік відаў дзейнасці, для ажыццяўлення якіх патрабуецца ліцэнзія, і органаў, што іх выдаюць, зацверджаны пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 16 кастрычніка 1991 года № 386. Дарэчы, каб займацца пашывам абутку, спецыяльнага дазволу не патрабуецца. Калі ж прадпрымальнік усё ж займаецца забароненай дзейнасцю або дзейнасцю, што патрабуе спецыяльнага дазволу, без гэтага самага дазволу, то ўвесь даход ад такой дзейнасці належыць залічэнню ў бюджэт. З прадпрымальніка спаганяецца яшчэ і штраф у памеры гэтага даходу. Акрамя таго, грамадзянін-прадпрымальнік, які працуе без права юрыдычнай асобы, можа быць прыцягнуты да такой жа адміністрацыйнай адказнасці, як і за прадпрымальніцкую дзейнасць без дзяржаўнай рэгістрацыі.

Па-трэцяе, на тэрыторыі нашай рэспублікі даход прадпрымальнік-грамадзянін павінен атрымліваць у рублях. Бо, згодна з загадам Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь «Аб часовым парадку правядзення валютных аперацый на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь», выплата грамадзянам-рэзідэнтам заработнай платы, прэмій і любых відаў заахвочвання ў замежнай валюце на тэрыторыі рэспублікі не дазваляецца.

І, нарэшце, прадпрымальнік павінен своечасова і ў поўным аб'ёме плаціць падаткі, а таксама прадстаўляць у падатковую інспекцыю дэкларацыю аб даходах, калі гэта патрабуецца ў адпаведнасці з падатковым заканадаўствам рэспублікі.

Так што добрасумленна, своечасова выконвайце ўсе гэтыя ўмовы і атрымлівайце, калі ласка, свой даход. Ён будзе законным, нават калі складзе і мільён.

Уладзімір КУПЧЫНСКІ,
юрыст.

Ад моста да моста...

З прадукцыяй Фаніпальскага завода жалезабетонных маставых канструкцый знаёмы, бадай, кожны з нас. Калі едзеш па аўтамабільных дарогах рэспублікі, часта сустракаюцца вялікія і малыя масты, пуцеправоды і іншыя збудаванні. Іх ужо не дзесяткі, а сотні. Унікальнымі можна лічыць масты балечнападвяснай сістэмы праз раку Нёман (працягласцю 240 метраў), праз раку Бярэзіна каля Барысава (200 метраў), праз Сож (900 метраў) і Прыпяць (1.000 метраў). Адзіны такога профілю завод у рэспубліцы набыў сабе рэпутацыю надзейнага дзелавога партнёра, садзейнічаў павышэнню працаздольнасці транспартных камунікацый у рэспубліцы, эстэтычнаму выгляду аўтамабільных дарог.

Праўда, апошнім часам аб'ёмы будаўніцтва дарог у рэспубліцы значна скараціліся. Таму завадчане расшыраюць зону збыту. Заключаны кантракты з прадпрыемствамі Расіі, Прыбалтыкі. З першым партнёрам узаемадзеянне асабліва неабходнае. Фаніпальцы выкарыстоўваюць каля дзевяці тысяч тон металу, які паступае ў асноўным ад усходняга суседа.

— Цяпер вядзецца ўзбуйненне завода, — расказвае яго дырэктар Фёдар Уладзіміравіч Стрыкаў. — З гэтага года пачалі выпуск вырабаў для прамысловага і грамадзянскага будаўніцтва: фундаментныя і сценавыя блокі, пліты перакрыцця, што дазволіць нам комплексна пастаўляць цэлыя дамы. Вядуцца перадпраектныя работы па будаўніцтве цэха, дзе будуць выпускацца толькі лёгкія сценавыя блокі. Гэта будзе практычна невялікі новы завод.

Характэрная рыса завадчан — высокая адказнасць, а значыць — добрая якасць прадукцыі. Не могуць яны халтурыць на маставых канструкцыях, — гэта ж бяспека вадзіцеляў і пасажыраў аўтамабільнага транспарту. Шмат гадоў працуюць тут Надзея Альховік, Раіса Майсак, Вера Ячная, Аляксандр Мілашэўскі, Леў Чулімаў.

Завод — першынец прамысловасці Фаніпаля, які даў штуршок яго развіццю. Цяпер гэта ініцыятар жыллёвага і культурна-бытавога будаўніцтва ў пасёлку. Шматпавярховыя дамы, дзіцячыя пляцоўкі, садок-яслі, магазін — усё гэта клопаты завадчан. Вось і зараз заканчваецца будаўніцтва 28-кватэрнага дома, у планах увод 60- і 40-кватэрных дамоў. Гэта дае магчымасць завадчанам пасля пятнаццаці гадоў работы стаць у чаргу на расшырэнне свайго жылля, хоць і прыпадае на чалавека шэсць квадратных метраў. Таму многія маладыя сем'і з трох чалавек атрымалі тут чатырохпакаёвыя кватэры, сем'і з двух чалавек — двухпакаёвыя.

— Клопаты аб людзях заўсёды былі ў нас на першым плане, — гаворыць Фёдар Уладзіміравіч. — Апошнім часам мы шмат даведаліся пра японскія і шведскія цуды. Там сапраўды створаны ўсе ўмовы для жыццядзейнасці чалавека. Нам да іх, безумоўна, далёка, але дзеля людзей трэба імкнуцца да гэтага. Наш завод працуе стабільна толькі дзякуючы тым людзям, якія сумленна тут працуюць.

НА ЗДЫМКАХ: дырэктар завода Фёдар СТРЫКАЎ; старшыня прафкома Генрых СІНКЕВІЧ (другі злева) гутарыць са зваршчыкамі Браніславам ЖДАНОВІЧАМ, Сяргеем ЖДАНОВІЧАМ, Міхаілам КОТАВЫМ, механікам Сяргеем БУХАЎЦОМ; брыгадзір фармоўшчыкаў Леў ЧУЛІМАЎ.

Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ.

ЯК У ВЁСАЧЦЫ КУЛІ ЗАВЯЛІСЯ КУРКУЛІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Няма ніякай упэўненасці ў заўтрашнім дні ў Філіповічаў і сёлета. Па-першае, кармоў малавата. Зямля, якую ім сёлета выдзелілі, — палынны сухадол (два гектары). Таму збіраюць на палях мякіну, салому, што засталіся пасля уборкі. І тое не без страху, а раптам адбяруць, як тую бульбу. Вясной, праўда, мясцовы калгас «Новае жыццё» прадаў фермерам салому, хоць і гнілаватую. А ўзяў па 300 рублёў за тону. У той жа час суседняя гаспадарка «Зарэчча» прадала салому па 32 рублі за тону. Сёлета спрабавалі Філіповічы сена купіць у калгасе, але ім за такую цану прапанавалі (больш за 2,5 тысячы рублёў!), што ў іх усіх іхніх фінансаў не хопіць. Па-другое, мясцовыя ветработнікі адмаўляюцца лячыць жывёлу — на гэта ёсць забарона кіраўніцтва калгаса. Па-трэцяе, няма гарантыі, што зноў не адмовіцца калгас забіраць прадукцыю. Можна было б на рынак завезці, на малаказавод — але на чым, ды і калі — гаспадарку ж не кінеш без нагляду.

Ёсць пытанні і з залікам малака, вызначэннем яго якасці. Самі фермеры лічаць, што робіцца гэта не заўсёды дакладна, з-за чаго яны страчваюць значныя грошы — прыкладна 500 рублёў у месяц.

Як жа думаюць жыць і працаваць далей Філіповічы?

— Цяжка сказаць, — са скрухай зазначае Міхаіл Сяргеевіч. — Зараз у нас дзевяць кароў, тры бычкі, трое цялят. Такі гурт мы яўна не пракормім. Прыйдзецца здаваць ці рэзаць жывёлу, хоць і шкада.

Вось так Філіповічы хацелі сябе і народ накарміць. Не атрымалася. Значыць, ураду трэба не проста даць «добра» на існаванне фермерства, а выпрацаваць пэўную праграму яго абароны і заахвочвання, падтрымкі. Тады і прадукцыя будзе, і здаровая канкурэнцыя, а ў выніку выйграем мы ўсе.

Зараз цяжка людзей на штонебудзь загітаваць, але можа знойдуцца такія, хто не без выгады для сябе дапаможа Філіповічам. Хацелася б на гэта спадзявацца...

Іван СУРМАН.

Уздзенскі раён.

НЕАБХОДНЫЯ ЎДАКЛАДНЕННІ

Як правільна заўважае наш аўтар, ураду трэба выпрацаваць пэўную праграму абароны і заахвочвання, падтрымкі фермерства. Цудоўная прапанова, але хто канкрэтна яе будзе ажыццяўляць? Напэўна, Мінсельгаспрад? А ён у гэтым кроўна, ну, проста пытанне жыцця і смерці, зацікаўлены? Той Мінсельгаспрад, «трывалы падмурак» якога калгасы і саўгасы? Ён будзе «абараняць і заахвочваць» фермерства? У мяне наконт гэтага пэўныя сумненні. Не, чаму, магчыма і такое, але для гэтага сённяшняе міністэрства трэба ліквідаваць, пасадзіць там новых людзей і поўнасцю змяніць яго функцыі. Але тут мы маем палку з двума канцамі: міністэрства ў прынцыпе разагнаць можна, шмат розуму на гэта не трэба. Але хто ўсё ж будзе абараняць фермераў, якіх па 5—7 на раён? Словам, ніхто зараз праграмамі «абароны і заахвочвання» займацца не будзе. Не тая гістарычная сітуацыя.

У той жа час, ёсць факты, міма якіх, як бы ні хацеў, не пройдзеш. Мне так часта прыходзілася чуць на самых розных пасяджэннях і ад самых розных і вельмі ўплывовых асоб, што па фермерству прыняты законы і пастановы і іх трэба выконваць, інакш кажучы, абараняць фермера ад глупства мясцовага начальства, што даўна чытаць матэрыял Івана Сурмана. Можа я сам дурны, але мне чамусьці не даспадобы слухаць разумныя заўвагі: «Ды што ты, не будзь наіўным, усюды так і ніхто нідзе пальцам не варухне». Я наіўны, таму хачу зразумець, чаму ні пракуратура, ні мясцовыя з вышэйстаячым зямельныя камітэты не зробяць тое, што ад іх патрабуецца. Справа не аб тым, што было першым: курыца ці яйцо, калгас ці фермер. Гаворка пра тое, што ёсць непрыгожыя факты і ім неабходна даць прававую ацэнку. Толькі і ўсяго.

Сяргей ШАЎЦОЎ.

ПРАВЕРЦЕ ПРАВІЛЬНАСЦЬ АФАРМЛЕННЯ АБАНЕМЕНТА

На абанеменце павінен быць прастаўлены адбітак касавай машыны.

Пры афармленні падпіскі (пераадрасоўкі) без касавай машыны на абанеменце прастаўляецца адбітак каляндарнага штэмпеля аддзялення сувязі. У гэтым выпадку абанемент выдаецца падпісчыку з квітанцыяй аб аплаце кошту падпіскі (пераадрасоўкі).

Для афармлення падпіскі на газету або часопіс, а таксама для пераадрасавання выдання бланк абанемента з даставачнай карткай запаўняецца падпісчыкам чарнілам, разборліва, без скарачэнняў, адпаведна ўмовам, выкладзеным у каталогах.

Запаўненне месячных клетак пры пераадрасаванні выдання, а таксама клеткі "ПВ-МЕСЦА" робіцца работнікамі прадпрыемстваў сувязі.

ПАДРАСТАЮЦЬ У БРЭСЦЕ МАРАКІ

Партовым горадам Брэст не назавеш, але свая флатылія ў ім усё ж ёсць. Мясцовыя вадаёмы баразняць крэйсерскі катэр, тры вучэбна - парусныя боты, плыўбаза, дзесяць шасцівёсельных ялаў з паруснай аснасткай. Гаспадараць на суднах падлеткі з клуба юных маракоў. Больш тысячы хлапчукоў і дзяўчынак асвойваюць у ім прамудрасці карабельнай службы. Нядаўна некаторыя з іх пабывалі ў Архангельску на злёце юных маракоў. Вярнуліся з мноствам прызоў, з вялікімі ўражаннямі ад сустрэчы з горадам паўночных маракоў, з радзімай Міхаіла Ламаносава, з Белым морам.

НА ЗДЫМКУ: юныя маракі Коля КАРАБЕЙКА, Таня ПЛЮШЧАВА, Слава МІГЕЛЬ і Лена ГОВАРАВА пабывалі на злёце ў Архангельску.

Фота Эдуарда КАБЯКА. (БЕЛІНФАРМ).

РЭХА ПУБЛІКАЦЫІ

«АБРЫДЛА МАЎЧАЦЬ, НАС УЖО І ЗА ЛЮДЗЕЙ НЕ ЛІЧАЦЬ...»

«ЗВЯЗДА», 26.08.92 г.

Публікуючы гэта не зусім звычайнае пісьмо, рэдакцыя ніколькі не сумнявалася, што яно не застанецца незаўважаным, што яно выкліча жаданне ў нашых чытачоў узяцца за пяро. І мы не памыліліся. Публікацыя сапраўды атрымала вялікі рэзананс, аб чым сведчаць водгукі, якія мы таксама вырашылі сёння абнародаваць. Нагадаем: гутарка ў пісьме ішла аб тым, што хвалюе кожнага. А іменна — за чый рахунак дзяржава збіраецца выходзіць з сённяшняга эканамічнага становішча...

ШТО РОБІЦЬ УРАД, КАЛІ ЯГОНЫЯ «ДЗЕЦІ» СВАВОЛЬНІЧАЮЦЬ?

У «Звяздзе» (№ 171) не выпадкова зайшла гаворка аб датацыі з бюджэту для вытворчасці самых неабходных штодзённых прадуктаў. І паважаная пані І. Палянічка, начальнік аддзела Дэпартамента цэн пры Дзяржэканомплане РБ, спасылаецца на «беднасць бюджэту рэспублікі», тлумачыць гэта «свавольствам» прадпрыемстваў. Але прыкладна 90 працэнтаў існуючых у рэспубліцы прадпрыемстваў — дзяржаўныя, гэта значыць, знаходзяцца пад кантролем урада (зрэшты і калгасы). Вось і хацелася б спытаць, а што робіць урад у той час, калі ягоныя «дзеці» свавольнічаюць?

Наколькі ведаю, у цывілізаваных краінах не адзін дзесятак гадоў існуе адпрацаваны эканамічны механізм прамога і ўскоснага ўздзеяння на прадпрыемствы, якіх закон прымушае існаваць у сістэме раўнаважкага самакіравання, што падтрымліваецца заканатворцамі. Вядома, рабілася гэта не адразу, паступова ў кожным асобным выпадку.

З гэтай нагоды немагчыма лічыць абгрунтаванымі абвінавачванні ў адрас чытача К. Тамашэвіча (акрамя, зразумела, «зброі, барацьбы» і іншага таму падобнага) з боку дзяржаўнай асобы, якая абураецца, між іншым, тым, што і «яго завод павысіў цану на сваю прадукцыю». А ўрад як быццам і не мае да гэтага ніякага дачынення. Ці так гэта?

Закранаецца пытанне, што прапанаваць канкрэтнае дзеля захавання бюджэту рэспублікі больш-менш дастойнага дзяржавы, нашай Бацькаўшчыны? Бо бюджэт бедны не таму, што туды мала што трапляе, маючы на ўвазе фантастычныя, беспрыкладныя падаткі, а, відавочна, таму, што народныя грошы «знікаюць», відаць, бессістэмна, неразумна і часам невядома куды?

А. ІОНЧАНКАЎ,
беспрацоўны на час напісання водгуку.

г. Наваполацк.

ДЗЯКУЙ ЗА ГРАМАДЗЯНСКУЮ МУЖНАСЦЬ!

Вялікі дзякуй вам за грамадзянскую мужнасць, праяўленую ў факце публікацыі пісьма «Абрыдла маўчаць, нас ужо і за людзей не лічаць». Гэты выдатны подзвіг вы здзейснілі, нягледзячы на тое, што вас могуць пазбавіць датацый дзяржавы, гэта герагічны крок, яго можна паставіць на адну ступень з такім цыклам матэрыялаў, як «Хто ёсць хто» на пачатку сёлетняга года. Віншую вас з гэтым і яшчэ раз — вялікі дзякуй!

Аляксандр КЛЯШЧОНАК.

Крупскі раён.

Я ТАКСАМА — ЗА РЭФЕРЭНДУМ. І БУДУ ГАЛАСАВАЦЬ ЗА САЦЫЯЛІЗМ

Цалкам адабраю пісьмо, надрукаванае 26 жніўня, якое даслаў К. Тамашэвіч. Дзякуй рэдакцыі за тое, што апублікавала такі праўдзівы ліст, і дзякуй Тамашэвічу за яго праўду і смеласць напісаць яе. Хто б ні чытаў гэтае пісьмо-праўду, усе гавораць: малайчына, больш бы такіх людзей! Я так напісаць не магу, але хачу дабавіць, што ўрад наш жыве толькі для сябе, а да народа яму няма справы. Факты? Павышэнне цэн на такія тавары, як цукар, гарэлку, алей, якія атрымліваем па талонах. І праводзіцца яно не з 1 чысла, а з 15 ліпеня ці жніўня, тады, калі некаторыя ўжо атаварылі талоны намнога танней, чым тыя, хто не паспеў іх атаварыць або не хапіла ў магазіне прадуктаў. А гэта ж па талонах, і лішняга, здавалася б, ніхто не возьме. Я таксама за рэферэндум буду галасаваць і толькі за сацыялізм.

Я інвалід першай групы. Сястра — таксама першай групы. Старая маці, 90 гадоў, даглядае нас. І вось пасля маіх скаргаў у розныя інстанцыі нам выдзелілі «Запарожац». На ім возіць нас наш брат, дапамагае нам. Але Савет Міністраў прымае пастанову аб ільготах для інвалідаў усіх катэгорый па абслугоўванню машын. Мы ж заплацілі за машыну 2.000, і нам няма ніякіх ільгот па абслугоўванню машыны, і на бензін не даюць ні рубля. Пенсію атрымліваем па 1.200 рублёў, а як машыну ўтрымліваць без дапамогі?

Павел АКУЛІЧ.

г. Светлагорск.

P. S. Вашу газету «Звязда» я выпішу абавязкова. Ужо выразаў надрукаваную ў ёй квітанцыю.

САБАКА БРЭША, А КАРАВАН ІДЗЕ...

Не думаў, што вы рызыкнеце апублікаваць такі матэрыял, як пісьмо К. Тамашэвіча. Але калі ўжо рызыкнулі, апраўдвацца (перад кім?), растлумачваючы прычыны апублікавання і заяўляючы аб нязгодзе з аўтарам, відаць, не варта было. Тым больш не варта, на мой погляд, пісаць: «Значна цяжэй і больш складана прапанаваць хоць што-кольвечы разумнае, талковае...» Паспрабую растлумачыць, чаму я так лічу.

Любое развіццё пачынаецца з адмаўлення існуючага ці яго часткі, а значыцца, тэзіс «перш чым крытыкаваць, прапануй лепшае» — тормаз для развіцця. І. Палянічку вы не крытыкуеце, хоць у яе каментарыі, акрамя канстатацыі фактаў і галаслоўнага абвінавачвання аўтара ў закліках да зброі, нічога няма. Дарэчы, стары прыём з таго ж арсенала: «Не можаш абвергнуць думкі, ідэі — абвінавачь у чым-небудзь іх аўтара». Яе ж кантора таксама мае дачыненне да росту цэн — рэгулюе іх толькі ў адзін бок і не прымае ніякіх дзейсных мер супраць спекуляцыі таварамі дзяржаўных прадпрыемстваў навяўленымі камерсантамі.

Што датычыцца таго, чаму катастрафічна мала прапаноў па паляпшэнню існуючага становішча, дык, думаю, так і павінна быць — гэта нявыгадна як тым, хто ўстанаўлівае правілы гульні, каму сёння рэальна належыць (ці амаль належыць) улада (а гэта зусім не Шушкевіч з Кебічам і нават не Вярхоўны Савет), так і тым, за чый кошт багацеюць намінальна маючыя ўладу.

Па ўзмоцнена прапагандуемай версіі сацыялізм — гэта вельмі дрэнна, а капіталізм, наадварот, — вельмі добра. Тлумачыцца гэта так: у нас быў пабудаваны сацыялізм (а ў гэтым як нашы ўчарашнія правадыры, так і цяперашнія «дэмакраты» аднадушныя), а жылі мы вельмі дрэнна, значыць сацыялізм — гэта дрэнна, а вось, скажам, у быццам бы капіталістычных Швецыі і Даніі жывуць значна лепш за нас, значыць, капіталізм — добра. І гэты прапагандысцкі трук таксама з таго ж старога арсенала. Яшчэ Гебельс гаварыў, што чым больш грандыёзная хлусня, тым хутчэй у яе павераць.

Перш чым працягваць размову, давайце вызначымся ў паняццях, удакладнім, што ёсць што?

Сацыялізм — грамадства сацыяльнай справядлівасці, галоўны прынцып якога «ад кожнага па здольнасцях, кожнаму па працы». Капіталізм — грамадства эксплуатацыі чалавека чалавекам, пры гэтым не мае значэння, хто каго эксплуатуе, немец немца ці, скажам, англічанін індуса. (Я наўмысна не гавару пра іншыя прыкметы, а спыняюся толькі на галоўным, вызначальным).

Для таго каб аднекуль некуды рухацца — з пункта «А» ў пункт «Б» ці ад капіталізму да сацыялізму (ці наадварот), — неабходна, перш за ўсё, вызначыцца: дзе мы сёння знаходзімся і куды хочам прыйсці, гэта значыць, у якім грамадстве жывём і якое хочам пабудаваць.

На маю думку, у нашай краіне (я маю на ўвазе СССР) ад сацыялізму была толькі назва. У сталінскія часы ў нас мелі месца амаль усе вядомыя цяпер грамадска-палітычныя фармацыі: рабаўладальніцкі лад (ГУЛАГ), прыгонніцтва (калгасы), дзяржаўны капіталізм (прамысловасць) і некаторыя зародкі сацыялізму (хутчэй дэклараваныя, чым рэальна існаваўшыя) у выглядзе бясплатнай медыцыны, адукацыі і г. д. Недалёка ад гэтага мы адышлі і за апошнія амаль тры дзесяцігоддзі.

Што датычыцца таго, які лад цяпер у «цывілізаваных» краінах, дык капіталізмам яго можна назваць з вялікім допушчэннем. Такі ж ён быў да рэформ Рузвельта і яго паслядоўнікаў. Дарэчы, палітычныя праціўнікі дарэмна называлі Рузвельта камуністам, не разумеючы, што, уводзячы некаторыя сацыялістычныя прынцыпы, ён ратуе сваю краіну (і іншыя заходнія краіны) ад сацыяльных узрушэнняў ці нават рэвалюцый.

Нам жа, абылгаўшы сацыялізм сапраўдны, прываблівaючы матэрыяльным становішчам на Захадзе, прапануюць будаваць найдзікейшы капіталізм. І мы яго ўжо будуем, знаходзячыся на першым этапе — этапе першапачатковага накаплення капіталу, дзе галоўнае правіла — чалавек чалавеку — воўк. Як пісаў яшчэ амаль трыццаць гадоў назад Ф. Крывін: «У воўчым грамадстве той наперадзе, у каго шмат зайцоў». Ён, праўда, меў на ўвазе сапраўдных зайцоў, але сутнасць ад гэтага не мяняецца. І калі зыходзіць з вопыту «цывілізаваных» краін, то да ўзроўню Швецыі нам трэба будзе расці многія дзесяцігоддзі, а можа нават стагоддзі. А гэта азначае, што матэрыяльнае (ды і маральнае таксама) становішча К. Тамашэвіча і соцень тысяч такіх, як ён, будзе пастаянна пагаршацца. Я ўжо не кажу пра тых, у каго яно цяпер дрэннае, а такіх большасць (гэта, дарэчы, ускосна пацвярджае і І. Палянічка ў сваім каментарыі). І К. Тамашэвіч занепакоены, па-мойму, не сённяшнім сваім становішчам, а яўна відавочнай тэндэнцыяй да яго пагаршэння. І. Палянічка, здаецца, правільна гэта зразумела і адпаведна каменціруе яго пісьмо.

Цяпер аб «разумным і талковым».

Адзіна разумным было б афіцыяльнае прызнанне таго, што мы хочам пабудаваць грамадства сацыяльнай справядлівасці, пры гэтым не мае значэння, як яно будзе называцца: сацыялізмам, грамадствам усеагульнага дабрабыту або яшчэ як. Але такое прызнанне прыняло б да неабходнасці прыняцця законаў, якія паляпшалі б становішча працоўных за кошт людзей з тоўстымі кашалькамі, а не наадварот, як цяпер. Вопыт заходніх краін паказвае: дабіцца чаго-небудзь такога працоўныя могуць толькі барацьбой за свае правы, за сваю чалавечую годнасць. І нашы нуворышы добраахвотна ад нарабаванага не адмовяцца. Гаворачы «нарабаванага», я проста называю рэчы сваімі імёнамі, таму што мне ўсё роўна, адымуць у мяне грошы з пісталетам у руках або без пісталета, шляхам узвінчвання цэн. У другім выпадку тое ж рабаванне, толькі «цывілізаванае».

Хачу сказаць яшчэ аб адной вялікай хлусні — я маю на ўвазе міф аб выратавальніку-рынку, які называюць лякарствам ад усіх бед і ў які нас сілай заштурхоўваюць тыя, хто на гэтым ужо грэе рукі. «Цывілізаваныя» краіны ішлі ад манапольнага да канкурэнтнага рынку дзесяцігоддзямі, выпрацавалі за гэтыя гады магутнае антыманапольнае заканадаўства. У нас жа, пры поўнай адсутнасці нават спроб стварыць такое заканадаўства, манапольны рынак будзе існаваць вельмі доўга, а значыць, цэны будзе дыктаваць прадавец і толькі прадавец, а мы, пакупнікі, будзем жаласлівымі прасіцелямі, жабракамі з працягнутай рукой. І пакуль існуюць супярэчнасці паміж новай буржуазіяй і працоўнымі, да таго часу будзе існаваць класавая барацьба, якую хтосьці паспяшаўся ўжо «адмяніць». Але класавая барацьба — гэта аб'ектыўная заканамернасць, і адмяніць яе ніхто не можа як бы гэтага ні хацелася. Як кажуць на Усходзе: «Сабака брэша, а караван ідзе». У якія формы выльецца класавая барацьба ў нас, залежыць ад многіх фактараў. Хацелася б, каб гэтыя формы былі сапраўды цывілізаванымі. У многім гэта будзе залежаць ад пазіцыі чацвёртай улады — сродкаў масавай інфармацыі, а значыць, і вашай газеты.

Я не грамадазнаўца, не палітык, па адукацыі і па роду дзейнасці я інжынер-механік, але заўсёды сам спрабаваў ва ўсім разабрацца і мець сваю думку, нягледзячы на тое, падабаецца ці не падабаецца гэта вышэйстаячым таварышам (або панам). І мой вопыт, мой узровень ведаў пераконваюць мяне ў тым, што дасягнуць дабрабыту ў кароткія тэрміны мы можам толькі на сацыялістычным шляху развіцця.

Свае думкі па гэтаму пытанню я выклаў вельмі схематычна, спрошчана і думаю, што вы зробіце вялікую справу, калі арганізуеце ў сваёй газеце дыскусію (вочную або завочную) пад дэвізам: «Хто мы, дзе мы, кім хочам стаць і куды ідзём?», запрасіўшы да яе прадстаўнікоў розных палітычных плыняў — ад вельмі левых да вельмі правых.

Анатоль ПРЖЭВАЛЬСКІ.

г. Мінск.

РОЗГАЛАС

«БУНТ» НА ЗАХОДНЯЙ ГРАНІЦЫ

БРЭСТ (Ю. Фёдарава). Сапраўды міжнародную салідарнасць праявілі вадзіцелі грузавікоў розных краін, што стаяць у доўгай чарзе да пагранпераходу «Казловічы» пад Брэстам. Знешне ціхая калона ўзбунтавалася. Прычына: доўгія чэргі, антысанітарыя, рэкет. Грузавікі заблакіравалі дарогу, што вядзе да граніцы, стварыўшы тым самым пробку да аўтамагістралі, якая абслугоўвае ўнутраныя патрэбы Брэста і вобласці.

Стыхійны бунт працягваўся нядоўга. Прадстаўнікі мясцовых улад арганізавалі гандаль напіткамі, гарачымі стравамі. Але хіба нельга было гэта зрабіць раней? Міліцыя паабяцала больш дзейсную ахову грузаў і экіпажаў ад рэкецiраў. Аднак праблема гэта больш сур'ёзная. Як вядома, толькі агульнымі намаганнямі дзвюх суседніх дзяржаў—нашай рэспублікі і Рэспублікі Польшча — можна радыкальна ў лепшы бок змяніць становішча на адным з буйнейшых у Еўропе пагранпераходаў.

У Брэсце нядаўна працавала польска-беларуская камісія па гэтай праблеме. Намечана ў бліжэйшы час адкрыць новыя пагранпераходы для грузавікоў. Аднак словы «бліжэйшы час» гучаць даўно. І такая няпэўнасць наносіць вялікі эканамічны ўрон, перашкаджае міжнароднаму гандлю і ў больш шырокім сэнсе ўзаемавыгадным адносінам паміж людзьмі еўрапейскіх краін. Наша інтэграцыя ў сусветную эканоміку немагчымая без нармальнай дзейнасці «заходніх варот».

ХЛЕБ ЧАРСЦВЕЕ НА ПРЫЛАЎКАХ

ТАЛАЧЫН. Яшчэ зусім нядаўна на хлеб у раёне быў ажыятажны попыт. Ён прадаваўся па спісах, нідзе не ляжаў свабодна. 30 тон штодзённай выпечкі не хапала, каб поўнасцю задаволіць попыт насельніцтва. Затое цяпер хлеб можна купіць без чаргі ў кожным магазіне, і зусім не таму, што на хлебазаводзе пусцілі дадатковую печ. Наадварот, у апошні час на прадпрыемстве вымушаны ў чацвер, пятніцу і суботу пячы хлеб на адной печы. Але ўсё роўна ён поўнасцю не рэалізуецца, чарсцвее і пакрываецца цвіллю на прылаўках. Лішкі яго вяртаюцца назад. Такая ж абстаноўка і з батонамі. Выпякаць іх сталі напалавіну менш. Хлебапёкі вымушаны ісці ў прымусовыя адгулы і заставацца без зарплаты. З дня на дзень чакаецца іх скарачэнне. Так што ў бліжэйшы час армія беспрацоўных раёнаў можа значна папоўніцца.

Барыкады разабралі, брандспойт павесілі...

Пазаўчора ў Мінскім вышэйшым ваенным камандным вучылішчы адбыліся беспарадкі. Даведзеныя да адчаю адносінамі да сябе камандавання курсанты трэцяга курса, не знаходзячы іншага выйсця з гэтай сітуацыі, пайшлі на крайні крок — забастоўку. Афіцэры, якія прыйшлі раніцай на службу, не змаглі ўвайсці ў казарму. Курсанты забарыкадзіравалі ўваход знутры, а з вокнаў віселі транспаранты: «Мы хочам жыць па-новаму», «Трэцяя рота аб'яўляе бестэрміновую забастоўку». А ўвогуле ўсё пачалося з-за загада № 150 міністра абароны, згодна з якім курсанты трэціх і чацвёртых курсаў атрымалі пэўныя льготы (свабодны выхад у горад, нашэнне ў невучэбны час цывільнага адзення).

Адзін з камандзіраў паспрабаваў штурмаваць дзверы, але хутка быў ахалоджаны струменем халоднай вады з пажарнага брандспойта. Да гэтага часу ў вучылішча прыбылі намеснік міністра абароны РБ генерал-маёр Ісайчанка і былы начальнік вучылішча Бамбураў, цяпер генерал-маёр і начальнік аддзела міністэрства па ваенных ВНУ. Аказалася, для вырашэння ўсіх праблем дастаткова крыху больш за паўгадзіны прысутнасці міністэрскіх чыноў. Пасля таго, як яны пайшлі, барыкады былі разабраны, брандспойт павешаны на месца і ў вучылішчы ўсталявалася цішыня...

Дзмітрый КРАТ, РІД.

РАДЫЁ ФАКТ

УРАД РАСІІ ПРЫНЯЎ РАШЭННЕ АБ АДПУСКАННІ ЦЭН НА НАФТУ І ВУГАЛЬ з тым, каб яны маглі дасягнуць узроўню сусветных на працягу 1993 года. Разам з тым, цэны на газ застаюцца пад кантролем дзяржавы. Гэтыя меры прадугледжаны ў адобранай кабінетам міністраў канцэпцыі энергетычнай палітыкі Расіі. Прапанавана таксама ўвесці з краінамі СНД практыку папярэдняй аплаты за пастаўкі паліва. Зразумела, чарговае павышэнне цэн на энерганосьбіты выкліча і непазбежны рост цэн на тавары і паслугі.

●

«У БЕЛАРУСІ СТВОРАНА УПРАЎЛЕННЕ МАРСКОГА ФЛОТУ. Прызначаны яго начальнік і намеснік, ідзе падбор кадраў у аддзелы ўпраўлення», — сказаў у інтэрв'ю «Радыёфакту» капітан далёкага плавання дырэктар Беларускай марской кампаніі «Белфлот» Міхаіл Саўчанка. Зараз вядзецца прапрацоўка розных варыянтаў набыцця суднаў.

●

ВІЦЭ-ПРЭЗІДЭНТ ЕЎРАПЕЙСКАГА БАНКА РЭКАНСТРУКЦЫІ І РАЗВІЦЦЯ Марыё Сарцынелі ўручыў старшыні праўлення Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь Станіславу Багданкевічу афіцыйнае запрашэнне прыняць удзел у пасяджэнні праўлення. На ім будзе абмяркоўвацца стратэгія банка ў адносінах да Беларусі. У ходзе сустрэчы Станіслаў Багданкевіч яшчэ раз пацвердзіў сваю прыхільнасць рублёвай зоне, агаварыўшы, аднак, верагоднасць выхаду з яе Беларусі ў выпадку невыканання Расіяй сваіх абавязацельстваў.

●

СА СКАРГАЙ НА ПРЭМ'ЕР-МІНІСТРА ВЯЧАСЛАВА КЕБІЧА звярнуўся ў пракуратуру рэспублікі, кантрольную палату і Міжнародную арганізацыю працы Незалежны прафсаюз гарнякоў Беларусі. У звароце гаворыцца, што прэм'ер падпісаў пастанову «Аб заказванні заканадаўства аб дзяржаўным сацыяльным страхаванні», якое ўваходзіць у супярэчнасць з дзеючым цяпер заканадаўствам. Пастановай Савет Міністраў абавязвае кіраўнікоў забяспечыць паступленне грашовых сродкаў у фонд сацыяльнага страхавання, створаны Федэрацыяй прафсаюзаў рэспублікі. Але ж Незалежны прафсаюз гарнякоў у гэтую федэрацыю не ўваходзіць.

●

ПРЫ УЕЗДЗЕ У ЛАТВІЮ У ПАШПАРТЫ ГРАМАДЗЯНАМ РЭСПУБЛІК СНД цяпер ставіцца спецыяльны штамп, які дазваляе знаходзіцца тут 90 дзён, а пры выездзе — адзнака аб выездзе. Такі парадак зацверджаны Саветам Міністраў Латвійскай Рэспублікі. Парушальнікам гэтых правіл можа быць пастаўлена ў пашпарт адзнака, якая забараняе ўезд у рэспубліку на працягу трох гадоў.

●

СУР'ЕЗНАЯ КАНФРАНТАЦЫЯ ЧАКАЕ У БЛІЖЭЙШЫ ЧАС УЛАДЫ САЛІГОРСКА З МЯСЦОВЫМІ УЛАДАЛЬНІКАМІ САБАК. Сесія гарадскога Савета прыняла рашэнне абкласці ўсіх сяброў чацвераногіх штогадовым грашовым зборам ў 1.000 рублёў. Такім чынам тут вырашылі папоўніць мясцовы бюджэт.

РАСЧАХЛЯЙЦЕ, ПАЛЯЎНІЧЫЯ, РУЖЖЫ!

Заядлыя паляўнічыя ўжо могуць расчахліць ружжы і праверыць сваё вока на меткасць, таму што з 12 верасня ў Беларусі адкрываецца летне-асенні сезон палявання «па пяру». Аб гэтым паведамілі сёння карэспандэнту БЕЛІНФАРМА ў рэспубліканскім Міністэрстве лясной гаспадаркі і Дзяржаўным камітэце па экалогіі, чыім загадам раней было накладзена вета на жнівеньскае адкрыццё паляўнічага сезона.

Новым распараджэннем дазволена паляваць толькі ў тых месцах, дзе нармалізавалася пажарная абстаноўка: гэта Мінская, Брэсцкая, Віцебская і Гродзенская вобласці. Тэрыторыі паляўнічых угоддзяў Гомельскай і Магілёўскай абласцей, дзе да гэтага часу гараць лясныя масівы, пакуль што застаюцца закрытымі. Акрамя таго, па-ранейшаму не дапускаецца паляванне ва ўгоддзях, дзе былі тарфяныя пажары.

Кацярына ВЫСОЦКАЯ. (БЕЛІНФАРМ).

«ПАКУЛЬ ПРЭСА НЕ ЗВЕРНЕ ЎВАГУ...»

МІНСК. 10 верасня пасля тыднёвага папярэджання на плошчы Незалежнасці аб'явіў галадоўку вядомы журналіст Вітаўт Мартыненка, былы карэспандэнт газеты «Чырвоная змена». Галадаючы трымае ў руках плакат, на якім напісана, што яго незаконна асудзілі па крымінальных артыкулах, хоць можна было абысціся адміністрацыйнай адказнасцю.

Як паведамілі ў рэдакцыю «Звязды» з прэс-цэнтра МУС РБ, устаноўлена, што 30 ліпеня гэтага года народным судом Мінскага раёна В. Мартыненка быў асуджаны па артыкулах 17 і 192 КК Рэспублікі Беларусь за падробку вадзіцельскага пасведчання на 6 месяцаў папраўчых работ з вылічэннем 15 працэнтаў зарплаты ў даход дзяржавы. Журналіст не згадзіўся з гэтым прысудам і звярнуўся ў Мінскі абласны суд, але апошні 4 верасня пакінуў рашэнне раённага суда ў сіле. Акрамя таго, галадаючы ў сваім плакаце паведамляе аб тым, што ён хворы на цукровы дыябет, якім быццам бы яго заразілі ў дзяцінстве ўколам, а потым, нягледзячы на тое, што хворых на цукровы дыябет раней не прымалі ў ВНУ, яму далі магчымасць вучыцца ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Дарэчы, хворым на цукровы дыябет не дазвалялася таксама кіраваць транспартнымі сродкамі, чым пагрэбаваў Мартыненка. 10 верасня з ім гутарыў начальнік аддзялення аховы грамадскага парадку Маскоўскага РАУС сталіцы капітан А. Савіцкі, якому Мартыненка паведаміў, што будзе галадаць на плошчы Незалежнасці да таго часу, пакуль на яго не зверне ўвагу прэса.

А. СЛАНЕЎСКІ, С. СУЛКОЎСКІ.

Беларускі канкурэнт «Мелодыі»

ВІЦЕБСК. У горадзе, вядомым правядзеннем славутых музычных фестываляў, нарадзілася і першая ў гісторыі Беларусі нацыянальная фірма грамзапісу «Белатон - Рэкордс». Ужо набыта неабходнае абсталяванне.

ІНФАРМАЦЫЯ ДЛЯ РОЗДУМУ:

КРАДЗЕЖ АЎТАМАБІЛЯЎ І РЭЧАЎ З ІХ

За сем месяцаў у рэспубліцы зарэгістраваны 2.782 крадзяжы з аўтамабіляў і 1.144 іх угоны. За адпаведны перыяд мінулага года на Беларусі адбылося адпаведна 2.458 крадзяжоў і 1.198 угонаў. Па Мінску гэтыя паказчыкі такія: 7 месяцаў 1991 года —299 крадзяжоў і 121 угон, 7 месяцаў сёлета — 321 і 150 адпаведна.

Падборку «Розгаласа» падрыхтавалі: Уладзімір Здановіч, Аляксандр Коктыш, Анатоль Сланеўскі, Станіслаў Сулкоўскі, Ігар Шчучэнка.

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

Цячэ беларускае паліва ў латышскі «ярок»...

ЯК ПРЫ ДЭФІЦЫЦЕ ПАЛІВА БЕЛАРУСІ УДАЕЦЦА ЗАБЯСПЕЧВАЦЬ ІМ СУСЕДНІЯ КРАІНЫ!

3 верасня «Звязда» надрукавала матэрыял «Зрабі людзям «дабро», яны табе адплацяць. Падрабязнасці справы аб дызпаліве для фірмы «Лідо». Гаворка ішла аб незаконным рээкспарце дызельнага паліва праз Беларусь у Латвію. Мы паспрабавалі расследаваць абставіны гэтай не зусім прыгожай і зусім антызаконнай здзелкі паміж рыжскай фірмай «Лідо» і Віцебскім аблвыканкомам (у асобе намесніка яго старшыні А. Г. Каралёва). А працяг гэтай справы не прымусіў сябе чакаць.

Днямі стала вядома наступнае. Яшчэ 2 верасня ў адрас Наваполацкага прадпрыемства па пастаўцы нафтапрадуктаў была адпраўлена тэлетайпаграма пад № 252303/856 за подпісам першага намесніка старшыні Дзяржкамнафтапрадукта Уладзіміра Сяргеевіча Іваніцкага. Змест гэтага адметнага дакумента можа пахіснуць самую грунтоўную веру ў парадак і справядлівасць. Даслоўна: «У адпаведнасці з пісьмом Віцебскай аблпракуратуры № 714 Д 92, падстаў для канфіскацыі 95 цыстэрнаў з дызельным палівам няма. Таму пацвярджаю ліцэнзію № 02-1129 ад 21.08.92 г. і на гэтай падставе адлампоўвайце паліва па трубаправоду».

Распараджэнне вышэйшага кіраўніцтва было правільна ўспрынята і бліскуча выканана: 4 верасня 6 тысяч тон расійскага дызпаліва пацякло па беларускіх трубах латышскаму спажыўцу. Калі ў «першай серыі» гэтага дэтэктыва размова ішла аб магчымасці парушэння пагаднення паміж краінамі СНД, то ў «другой» яно парушана. А гэта ўжо вялікая розніца!

Ну, добра, што ты зробіш з гэтымі спрытнымі хлопцамі — адпампавалі, дык адпампавалі. Але цікава: як з «дывідэндамі»? Дзе, скажам, абяцанае фірменнае зерне — раз, і 20 працэнтаў паліва для Беларусі — два? А няма ні таго, ні другога. Няма! І хоць ты што. І невядома — ці будзе.

Хачу абавязкова адзначыць: цыстэрны як стаялі, так і стаяць (праўда, ёсць інфармацыя, што іх нібыта расцягваюць), значыць, пампавалі па трубах паліва беларускага паходжання.

Важны момант: па сведчанню нашых інфарматараў У. С. Іваніцкі не пацвярджае свайго подпісу пад той няшчаснай тэлетайпаграмай. Ну што ж, такое магчыма: бывае, начальству няма часу і клерк «падмахне» яго подпіс самастойна. Праўда, ёсць некаторыя сумненні, пад занадта ўжо скандальным дакументам з'явіўся подпіс Уладзіміраа Сяргеевіча. Тут сто разоў падумаеш. На жаль, з ім самім не ўдалося звязацца. Ва ўсякім разе, ён можа нам пазваніць.

А зараз пакінем у спакоі дэталі і ацэнім сітуацыю ў цэлым. Зусім яна сумніцельная. З вялікай упартасцю Дзяржкамнафтапрадукт даводзіць справу да канца. Законы пісаныя не для гэтай установы, ці што? Мякка кажучы, здзіўленне выклікае тое, што на гэты інцыдэнт пакуль што ніяк не адрэагавалі Савет Міністраў (улада выканаўчая) і Вярхоўны Савет (улада заканадаўчая). Можа ён дробны, другарадны, так сказаць? Падумаеш, нейкія там 23 тысячы тон. Між іншым, на 20 жніўня ліцэнзій на вываз нафтапрадуктаў за межы рэспублікі выдадзена на 2,4 мільёна тон (!). Ствараецца ўражанне, што Беларусь як бы і не Беларусь, а, самае меншае, Арабскія Эміраты, дзе нафты — хоць заліся. Трэба сказаць, не толькі ў мяне такое ўражанне. Быў званок на высокім узроўні з Міністэрства бяспекі Расіі. Паважаная ўстанова ясна дала зразумець, што яна ў курсе апошніх падзей на беларускім рынку нафтапрадуктаў. Вось так. І ніколькі не дзіўна, хачу адзначыць.

Зноў жа, не здзіўлюся, калі з боку Расіі будуць зроблены «аргвывады». Усяму ёсць мяжа. У тым ліку, і гэтай, далёка не прыватнай гісторыі. Аб яе заканчэнні мы пастараемся чытачоў інфармаваць у далейшым.

Сяргей ШАЎЦОЎ.

P. S. Па апошніх звестках, справай вельмі зацікавіліся КДБ Рэспублікі Беларусь, а таксама народны дэпутат Я. М. Глушкевіч.

УСХОДНІ ГАРАСКОП НА НАСТУПНЫ ТЫДЗЕНЬ

Колаабрачэнне планет паўплывае ў першую чаргу на маладое пакаленне КАЗЯРОГА. Прызваны ў армію юнак акажацца ў ВПС ці ўнутраных войсках, учарашняга выпускніка ВНУ запросяць у прэстыжную арганізацыю. У асоб сярэдняга і старэйшага ўзросту наперадзе ў асноўным бесталковая дамашняя мітусня. Раўнівая жонка суправадзіць мужа нават у камандзіроўцы. Чакайце прыемнага ўзрушэння 17 і 18 верасня.

Астролаг прадказвае ВАДАЛЕЮ некаторыя небяспечныя павароты, дзе патрабуецца асцярожнасць. У ваша жыццё ўрываецца новая асоба, якая свядома ці мімаволі падштурхне да вераломства ў адносінах да старога сябра. Рызыкуеце страціць адданага чалавека. Стрыманасць неабходная і ў сардэчных справах, пазбягайце лішняй напорыстасці. Поспех заўтра лепш за паражэнне сёння, ці не праўда?

РЫБЫ па-ранейшаму адчуваюць сябе ў роднай стыхіі. Да вас прыхільная капрызная пані Удача. Бізнесмену, асабліва занятаму ў будаўніцтве і грамадскім харчаванні, яна дапаможа добра зарабіць. Выдатная ідэя наведае беспрацоўную даму — вы сарвяце куш, практычна не выходзячы з дому. Няхай паспяховы ход спраў ахавае вас ад частых застолляў, небяспечных перападаннем.

Кветну ўдачы сарве і АВЕН. Выгадная здзелка абяцае хуткія грашовыя паступленні. Адмоўцеся ад спакусы пусціць грошы на вецер вандраваннямі па магазінах — хутка вам спатрэбіцца наяўнасць. Добрасумленны чыноўнік можа спадзявацца на павышэнне і дадатковыя льготы. Закаханыя перажывуць хвалюючыя моманты 17 і 18 верасня. Жанчынам, хутчэй за ўсё, спатрэбіцца ўрачэбная дапамога.

ЦЯЛЕЦ заняты новай справай, дзе дабіваецца поспеху, і — сапраўдным бязмежжам сямейных сварак. Цудоўна праяўляюцца вашы творчыя здольнасці і ўменне пайсці на рызыку. Трэба прыняць прапанову аб сумеснай дзейнасці. Старэйшыя ў сям'і пастаянна перашкаджаюць у рабоце. Раззлаваная вашай занятасцю жонка ці сяброўка вось-вось стукне дзвярамі.

Над БЛІЗНЯТАМІ навіс фінансавы крызіс. Даводзіцца плаціць па мноству рахункаў. Нервовая сітуацыя ўскладняецца тым, што родныя не схільныя праніннуцца разуменнем вашых праблем. Не спрабуйце іх пераконваць, бо на даным этапе гэта дарэмна і нават шкодна. Юная дама пераможа на конкурсе прыгажосці або ў іншым спаборніцтве, а вось ад прэтэндэнтаў на прызы сярод дужага пола ўдача адвернецца.

На гарызонце РАКА астралагу бачыцца часовае прасвятленне. Дзелавы чалавек мае шанц хутка зарабіць, уклаўшы сродкі ў каротнатэрміновы праект ці аказаўшы пасрэдніцкія паслугі. Але служачага планеты абнісуць чашай удачы. З-за плятнарства вас пазбавяць прэміі. Нічога, пазней усё стане на свае месцы. Клапаціцеся пра кветку свайго кахання і, як гаварылі раней, «не ганіце коней».

ЛЕЎ рызыкуе наляцець на падводныя камяні славы. Вашы таленты атрымліваюць шырокае прызнанне, у гэтым і крыецца каварства. Хтосьці з блізкага акружэння стараецца азмрочыць вашы радасці. Дарэчы, частка віны падае і на вас, бо злёгку занесліся і ўспрымаеце пахвалы як нешта само сабой зразумелае. Паглядзіце на свае ўчынкі крытычна, будзьце больш ласкавымі з дамашнімі. Новае захапленне — толькі прывід кахання.

Для ДЗЕВЫ тыдзень будзе пазначаны ў першую чаргу дадатковымі затратамі. Так, у наш час прымаць гасцей і рабіць падарункі знаёмым і блізкім у дні іх урачыстасцей — нялёгка. Акрамя таго, прыйдзецца павялічыць фінансавую падтрымку малодшаму сваяку. На рабоце чакайце ў чацвер прыемных паведамленняў. Тым, хто мае хранічныя захворванні, настойліва рэкамендаваны адпачынак.

Напружанасць на рабоце і дома можа абярнуцца для ШАЛЯЎ нервовым зрывам. Вы праяўляеце рэдкую няўступлівасць у справах, мяркуючы, што выгадны кантракт вам паднясуць на сярэбраным блюдзе. Хвароба кагосьці з блізкіх запатрабуе ад вас немалых клопатаў. 14 і 15 верасня — крайне неспрыяльныя дні, калі відавочным становіцца поўны разрыў з любімым чалавекам.

На СКАРПІЕНА ўзвальваюць дадатковую нагрузку па службе. Не наракайце і не засмучайцеся, бо хутка пераканаецеся ў старой ісціне — што Бог ні зробіць, усё да лепшага. Вы лёгка пасварыцеся з апанентам і нават ператворыце іх у сваіх прыхільнікаў. Любая сварка на сардэчнай глебе 14, 19 і 20 верасня завершыцца ўсплёскам пяшчотнасці. Жанчыны пры гэтым атрымаюць падарункі.

Канфігурацыя планет садзейнічае ўсебаковым поспехам СТРАЛЬЦА цудоўнага пола. Ваша напоўненая аптымізмам і энергіяй аўра дабратворна ўздзейнічае на акружаючых. Уласцівая вам гордая сціпласць прадухіліць антыпатыі нейкай уплывовай асобы. Будзьце гатовы з годнасцю вытрымаць тэст на сумленнасць і шчырасць. Праявіце абачлівасць па дарозе на работу — магчымая траўма. Каханы бурчыць? Вы не дастатнова ўважлівыя да яго.

Карэспандэнт ТАСС—ІТАР Сяргей БУЛАНЦАЎ. (Спецыяльна для «Звязды»). Дэлі.

СУПРАЦЬ ПАЖАРАЎ—ВЫМОВЫ

ГОМЕЛЬ (У. Пернікаў). У вёсцы Тульгавічы Хойніцкага раёна агнём знішчана 45 дамоў і каля 300 гектараў лесу. Адбылося гэта па той прычыне, што кіраўнік трэста «Калінкавічыводбуд» А. Свірыдзенка не выканаў распараджэння штаба ГА вобласці аб дастаўцы ў вёску неабходнай проціпажарнай тэхнікі. У Прудоцкім сельсавеце Калінкавіцкага раёна яго старшыня К. Філіпаў таксама самаўхіліўся ад арганізацыі работ, якія не дапусцілі б разгулу вогненнай стыхіі.

Гэтыя і іншыя прыклады прыводзіліся на пасяджэнні Гомельскага аблвыканкома, дзе на гэты раз вырашылі строга спытаць з вінаватых. Таму ж А. Свірыдзенку выказаны недавер, а перад кіраўніцтвам канцэрна «Палессеводбуд» пастаўлена пытанне аб вызваленні яго ад займаемай пасады. Аб тым, ці выкарыстоўваць надалей на ўказанай пасадзе К. Філіпава, будзе вырашана на чарговай сесіі сельсавета.

На пасяджэнні аблвыканкома строга папярэджаны кіраўнікі асобных раёнаў і абласных службаў аб іх персанальнай адказнасці за невыкананне намечаных аблвыканкомам мерапрыемстваў па ўтаймаванню шматлікіх пажараў. А яны пакуль што бушуюць больш як на 100 гектарах тарфянікаў і 500 гектарах лесу. «Чырвоны певень» працягвае прагна глытаць народнае багацце. Што дапаможа: вымовы аблвыканкома ці дождж, якога ў вобласці чакаюць ужо некалькі месяцаў?

Гэты «груз» цягае кожны з нас

МІНСК. Зараз у сталіцы Беларусі больш за 200 прамысловых аб'ектаў, якія забруджваюць навакольнае асяроддзе. Так, у 1991 годзе ў атмасферу Мінска было выкінута 2.682 тысячы тон шкодных рэчываў, у тым ліку аўтатранспартам — 1.558 тысяч тон. Такім чынам, на аднаго жыхара горада прыпадае па 150—160 кілаграмаў «атруты». Сёлета гэты «груз» павялічыўся яшчэ на 4—5 кілаграмаў. Дарэчы, агенцтва па ахове навакольнага асяроддзя ЗША да ліку небяспечных адносіць прадпрыемствы з аб'ёмам выкіду шкодных рэчываў у атмасферу звыш 100 тон у год. У Мінску ж такіх прадпрыемстваў больш за паўсотню.

Прадпрыемствы «адхрышчваюцца» ад дзяцей

ВІЦЕБСК. Нявыгадна цяпер прадпрыемствам утрымліваць уласныя службы сацыяльнай сферы. У заняпадзе клубы, даражаюць інтэрнаты, зачыняюцца дзіцячыя садкі. І нават летні адпачынак дзятвы ўляцеў для арганізацый у капеечку. Так, завод імя Камінтэрна ў гэта лета наогул не адкрываў свой «Космас». Пуставаў і лагер абкома прафсаюзаў «Лянок». Некаторыя лагеры працавалі ўсяго адну змену — на большае не хапіла рэсурсаў базавага прадпрыемства.

КАЛІ БЕДНАСЦЬ—ЗАГАНА...

Такая сумная выснова напрошваецца пасля слоў намесніка старшыні Цэнтральнага камітэта Таварыства Чырвонага Крыжа Беларусі Зінаіды Паўловіч аб тым, што «прабуксоўвае» іх зварот да насельніцтва, працоўных калектываў аказаць садзейнічанне ў нарыхтоўцы агародніны і садавіны для адзінокіх і састарэлых нашых землякоў, хто практычна апынуўся за рысай беднасці, бо што такое пенсія ў паўтары тысячы, калі толькі адзін кілаграм бульбы каштуе 24 рублі? А зімой адным кілаграмам не абыдзешся...

Неабходна дапамагчы цяпер, прыцягваючы ўсе сродкі, людзей і прадпрыемствы, падключаючы мясцовыя ўлады ў асобе дэпутатаў, грамадскія арганізацыі... І хаця зразумела, што многія вытворчыя структуры не могуць пералічыць грошы не столькі ад прагнасці, колькі ад беднасці, хочацца далучыцца да закліку ўявіць на месцы гаротных канкрэтнага блізкага чалавека. Змаглі ж неяк хоць часткова аплаціць нарыхтоўку пладова-агародніннай прадукцыі ў Кастрычніцкім райвыканкоме Мінска, досыць актыўна ідзе работа ў Пінску, Баранавічах, Бабруйску. Значыць, і ў беднасці можна думаць аб дапамозе больш беднаму?

Яна ВЕРАСЕНЬ, (БелаПАН).

ВЕРСІЯ

Замах на Леніна быў інсцэніроўкай

«У нас з Ільічом усё дамоўлена». 30.08.1918. Я. М. Свярдлоў

30 жніўня 1918 года быў зроблены замах на У. І. Леніна. Менавіта гэты «выстрал у сэрца рэвалюцыі» (па вобразнаму вызначэнню Свярдлова) стаў афіцыяльнай прычынай для пачатку «чырвонага тэрору», які забраў жыцці многіх тысяч лепшых сыноў Расіі. Замаху на Леніна прысвечана шмат гістарычных даследаванняў, успамінаў, манаграфій, аднак арэол таямнічасці па-ранейшаму ахутвае гэту заблытаную і загадкавую падзею.

Да жніўня 1918 года сітуацыя для бальшавікоў стала крытычнай. Па ўсёй краіне ішлі мецяжы і паўстанні, улада літаральна выслізгвала з рук. Яшчэ за месяц да спробы забойства ў пратаколах сумеснага пасяджэння ВЦВК, Маскоўскага Савета, прафесіянальных саюзаў і фабрычна-заводскіх камітэтаў ад 29 ліпеня 1918 года адзначалася, што «Савецкая ўлада павінна забяспечыць свой тыл, узяўшы пад кантроль буржуазію, праводзячы на практыцы масавы тэрор супраць яе». Такім чынам, для групы, якая ўчыніла кастрычніцкі пераварот, стала зусім ясна, што ўтрымаць уладу можна толькі пры дапамозе бязлітаснага тэрору і масавых забойстваў.

Аднак для пераходу да новай палітыкі патрэбна была добрая прычына накшталт «падпалу рэйхстага». Замах на кіраўніка рэвалюцыі быў найлепшай. За дзень да замаху Свярдлоў піша Леніну пісьмо, у якім просіць «назначыць пасяджэнне Саўнаркома заўтра не раней 9 гадзін вечара». Менавіта на гэтым пасяджэнні Свярдлоў зачытае зварот з наступнымі словамі: «На ўчыненне замаху, накіраванага супраць яго кіраўнікоў, рабочы клас адкажа яшчэ большай згуртаванасцю сваіх сіл, адкажа бязлітасным масавым тэрорам супраць усіх ворагаў рэвалюцыі». У памянёным пісьме Свярдлоў таксама піша, што «заўтра па ўсіх раёнах вялікія мітынгі па плану, аб якім мы з вамі дамаўляліся». (Тут і далей выдзелена мною.—**А. В.**). Адразу пасля замаху Н. К. Крупская спытала ў Свярдлова: «Як жа цяпер будзе?» У адказ ён сказаў незразумелую для яе фразу: «У нас з Ільічом усё дамоўлена!»

Калі меркаваць, што замах быў сапраўднай прычынай аб'яўлення «чырвонага тэрору», то трэба было чакаць, што ў першую чаргу і найбольш сурова будуць пакараны галоўныя яго арганізатары. Што ж адбылося ў сапраўднасці? Г. І. Сямёнаў —начальнік цэнтральнага баявога атрада і член бюро ваеннай камісіі ЦК партыі правых эсэраў, які кіраваў замахам на Леніна, потым выступіў з раскрыццём тэрарыстычных метадаў эсэраў і дэманстратыўна выйшаў з гэтай партыі. Не пацярпела ў гады «чырвонага тэрору» і Л. В. Канаплёва — член бюро ваеннай камісіі ЦК правых эсэраў, якая атрымала ад члена ЦК Рыхтэра яд кураре для атручэння куль і ездзіла ў Маскву для падрыхтоўкі замаху. У студзені 1921 года Канаплёва таксама выступіла ў друку з раскрыццём тэрарыстычнай дзейнасці эсэраў. Сама Фані Яфімаўна Каплан (прыроджаная Ройдман) як непасрэдны выканаўца, паводле сцвярджэння каменданта Крамля П. Д. Малькова, расстраляна 3 верасня 1918 года. «Штотыднёвік ЧК па барацьбе з контррэвалюцыяй і спекуляцыяй», які рэгулярна друкаваў аб'ёмныя спісы рэпрэсіраваных, у № 6 ад 27 кастрычніка 1918 года таксама прыводзіць прозвішча Каплан у спісе прыгавораных да расстрэлу. Вядома, аднак, што ў 30-х гадах у Магаданскай вобласці з'явілася жанчына са знешнасцю Фані Каплан, якая працавала бібліятэкарам. Існуюць версіі, што гэта была або сама Фані, або яе родная сястра. 31 жніўня 1918 года на допыце ў Петэрса Каплан паведаміла: «Маю чатырох братоў і трох сясцёр». Такім чынам, сёстры ў яе сапраўды былі. Аднак у паказаннях Д. І. Курскаму Фані ўдакладняе: «Цяпер уся мая сям'я паехала ў Амерыку».

Сёння цяжка аднавіць карціну замаху. Нават у дзень здарэння В. Д. Бонч-Бруевіч заявіў, што «тав. Гіль быў амаль адзіным сведкам, нягледзячы на вялікі натоўп народу». Вось што прыводзіць у сваіх паказаннях шафёр С. К. Гіль: «У момант павярнуў я галаву ў бок выстралу і ўбачыў жанчыну — тую самую, якая гадзіну назад распытвала мяне пра Леніна. Яна стаяла з левага боку машыны, ля пярэдняга крыла, і цэлілася ў грудзі Уладзіміра Ільіча. Адбыўся яшчэ адзін выстрал. Я імгненна спыніў машыну і кінуўся да страляючай з наганам, цэлячыся ёй у галаву. Яна шпурнула браўнінг мне пад ногі, хутка павярнулася і кінулася ў натоўп да выхаду». Цікава, што, выскачыўшы з тэрыторыі завода, Каплан спынілася каля дрэва і спакойна чакала, калі яе арыштуюць. З яе паводзін відаць, што яна баялася самасуду на месцы, але зусім не баялася арышту праваахоўнымі органамі.

Першага выстралу Гіль не бачыў, але побач з Каплан стаяла яшчэ адна жанчына, якая бачыла ўсё. Многія відавочцы паведамілі, што гэта жанчына, расказваючы аб злачынствах загараджальных атрадаў, дайшла з Леніным да самай машыны. Што ж здарылася з гэтай галоўнай сведкай? Яе падабралі параненую непадалёк ад выхаду з завода. Тлумачачы гэты факт, В. Д. Бонч-Бруевіч заявіў, што жанчына выбегла разам з натоўпам з двара завода. «Яна спачатку не адчула ранення, а потым упала і была дастаўлена ў бальніцу». Далей з'яўляюцца яшчэ больш загадкавыя паведамленні. Так, Н. Я. Іваноў праінфармаваў, што «параненую адвезлі ў бальніцу. Калі прыйшлі ў Петрапаўлаўскую бальніцу ўзяць бялізну для параненай, высветлілася, што яна — касцялянша гэтай бальніцы.., што яна аказалася невінаватай ахвярай тэрору буржуазнай наймміткі». У гэтай жанчыны не бяруць ніякіх паказанняў, і далейшы лёс яе невядомы.

У «Известиях ВЦВК» ад верасня 1918 года з'явілася цікавае паведамленне, што сляды кулі на пінжаку не супадалі з раненнямі на целе» (відаць, пінжак Леніна быў прастрэлены раней. — **А. В.**).

Арганізатарам інсцэніроўкі неабходна было растлумачыць раненне галоўнага сведкі наяўнасці лішняй дзіркі на пінжаку Леніна. Для гэтага трэба было даказаць, што выстралаў было тры, а не два, як сцвярджаў Гіль, і што куля ад гэтага трэцяга выстралу прабіла пінжак Леніна, не закрануўшы яго цела, і параніла жанчыну, якая стаяла побач. І вось у «Известиях ВЦВК» з'яўляецца наступнае паведамленне: «Учора ў ВЧК па аб'яве ў газеце з'явіўся адзін з рабочых, які прысутнічаў на мітынгу, і прынёс рэвальвер, адабраны ў Каплан. У абойме аказалася тры нерасстраляныя патроны з шасці». Мы памятаем, што свой браўнінг Каплан кінула пад ногі Гілю. С. Н. Батулін, які рабіў затрыманне і вобыск Каплан, ні пра які рэвальвер не паведамляе. Што ж гэта за загадкавы рэвальвер, які прынёс у ВЧК безыменны рабочы па аб'яве ў газеце? І калі ён яго паспеў адабраць у Каплан?

Можна прыводзіць шматлікія прыклады, як людзі з бліжэйшага акружэння Леніна ў дзень замаху праяўлялі незвычайную прадбачлівасць. Так, урач В. А. Обух, якога выклікалі да Леніна і не растлумачылі, у чым справа, раптам узяў з сабой хірургічныя інструменты. Ён растлумачыў гэта тым, што «інстынктыўна адчуў, што здарылася нешта сур'ёзнае». Пасля беглага агляду Обух заявіў: «Выжыве... Я ў гэтым перакананы... Склалася такое дакладнае ўнутранае перакананне, я нават не ведаю, чаму».

Цяпер аб характары ранення. Газеты яўна драматызавалі сітуацыю, запэўніваючы, што жыццё кіраўніка рэвалюцыі вісіць на валаску. Аднак...

1. Пасля ранення Ленін сваім ходам падняўся па крутой лесвіцы на трэці паверх (С. К. Гіль).

2. Прыехаўшы першым урач А. Н. Вінакураў знайшоў Леніна ля ложка, ён распранаўся.

3. Калі хвораму накладвалі павязку на параненую руку — ён не стагнаў. Гэта ўсіх тады ўразіла («Известия ВЦВК»).

4. 3 верасня 1918 года Уладзімір Ільіч устаў з ложка і без пабочнай дапамогі выйшаў. За гэта быў пакараны дзяжурны фельдшар (там жа).

Толькі 5 верасня Свярдлоў паведаміў у Петраград, што «жыццё Ільіча выратавана». Вядома, што 2 верасня было рашэнне ВЦВК, а 5 верасня Савет народных камісараў прыняў пастанову аб «чырвоным тэроры». Справа была зроблена, і таму толькі 5 верасня з'яўляюцца паведамленні ў друку, што жыццё Леніна па-за небяспекай.

5 верасня доктар Обух даваў інтэрв'ю газеце «Правда». Паколькі ў друку не было ніякіх паведамленняў аб аперацыі, здзіўлены карэспандэнт спытаў: «А кулі? А аперацыя?» У адказ Обух сказаў літаральна наступнае: «Ну што ж, іх хоць і цяпер можна дастаць— яны ляжаць на самай паверхні. Ва ўсякім разе, даставанне іх ніякай небяспекі не ўяўляе, і Ільіч будзе праз некалькі дзён зусім здаровы». Калі кулі знаходзіліся пад скурай на паверхні цела, то чаму ж цэлы тыдзень іх ніхто не спрабаваў дастаць? (Асабліва калі было падазрэнне, што кулі атручаныя). Хутчэй за ўсё, куляў проста не было— Каплан страляла халастымі патронамі!

У заключэнне хачу сказаць, што ў эпоху галоснасці любая абгрунтаваная версія мае права на існаванне, нават калі яна здаецца непраўдападобнай, дзікай і абуральнай для артадаксальных марксісцкіх фундаменталістаў. Самае непрыемнае ў гэтай гісторыі тое, што інсцэніроўка замаху не магла быць ажыццёўлена без прамога, актыўнага і, галоўнае, свядомага ўдзелу ў ёй самога Уладзіміра Ільіча.

Алег ВАСІЛЬЕЎ. «Независимая газета».

«Байкал вачамі пінчан»

ПІНСК. Так называецца выстаўка дзіцячых малюнкаў, якая адкрылася гэтымі днямі ў Пінску.

Незвычайная яе гісторыя. 76 вучняў мясцовай школы выяўленчых мастацтваў правялі летнія канікулы на возеры Байкал. Фінансавала гэтую паездку беларуска-галандскае прадпрыемства «Эка-Экспрэс». І першай творчай справаздачай юных пінчан стала выстаўка ва Улан-Удэ, якая прайшла з вялікім поспехам. Частка работ была падорана тады рэспубліканскай карціннай галерэі. І вось цяпер вернісажы прадстаўлены землякам.

МОЙ РОДНЫ КУТ

«Я ж—сын твой...»

О Наваградскі край—мой родны дом,
Праслаўлены Трамбецкага пяром.
Куды б мяне ні кінуў лёс жыццёвы,
Забыць я не змагу твае палі,
дубровы,—

гэтымі ўсхваляванымі радкамі пачынаецца адзін з ранніх твораў Адама Міцкевіча. Потым тая ж усхваляванасць з новай сілай прагучыць у баладах і санетах, у сусветна вядомых паэмах «Дзяды» і «Пан Тадэвуш». Праз усё жыццё пранёс геніяльны паэт пяшчоту і любоў да беларускай зямлі, на якой нарадзіўся 24 снежня 1798 г. на хутары Завоссе. Тут, на Наваградчыне, сярод маляўнічай прыроды, прайшло дзяцінства і юнацтва паэта. Тут ён разам са сваім сябрам Чачотам прагна прыслухоўваўся да беларускіх народных песень і казак, каб потым яны сталі неад'емнай часткай яго творчасці. Тут ён спазнаў першае каханне да Марылі Верашчака, якая натхніла Міцкевіча на лепшыя лірычныя вершы. Кожная мясціна, кожны куточак сучаснай наваградскай зямлі нясуць у сабе ўспамін аб тых даўніх часах, захавалі ў сваёй непаўторнай прыгажосці цеплыню душы песняра.

Нёман, прытулак мой хатні!
Празрыстай вадою
Ты абмываў мне калісь далоні.
Плыў па табе я, пакінуўшы родныя
гоні,
У землях далёкіх шукаць свайму сэрцу
спакою.

Так з замілаваннем успамінаў потым паэт. Паэзію душы, натхненне, палёт фантазіі — усё гэта дала яму беларуская зямля, якую ён апеў у сваіх творах.

Сёння на радзіме Адама Міцкевіча аднаўлены дом, у якім з 1807 г. і жыла сям'я паэта. Менавіта такі выгляд меў будынак, калі быў канфіскаваны расійскімі ўладамі ў 1834 г. за ўдзел Францішка Міцкевіча, старэйшага брата, у Варшаўскім узброеным паўстанні.

Справа ў тым, што пасля таго, як яно было падаўлена, Францішак эмігрыраваў у Прусію, а дом Міцкевічаў перайшоў у чужыя рукі. У 1881 г. ён згарэў і толькі праз шэсць гадоў быў адбудаваны гаспадаром, але ў змененай форме. У 1938 г. жыхарамі Наваградка ў гэтым доме быў створаны музей Адама Міцкевіча. У першыя дні вайны ён згарэў. І быў адноўлены толькі ў 1955 г. да 100-годдзя з дня смерці паэта, але не ў тым выглядзе, які меў пры жыцці Міцкевічаў.

І толькі нядаўна супрацоўнікі музея змаглі гэта даказаць. Дырэктар дома-музея Лілія Уладзіміраўна Усенка і старэйшы яго навуковы супрацоўнік Соф'я Мікалаеўна Анісімава доўгі час працавалі ў Варшаўскім літаратурным музеі імя Міцкевіча. І калі было сабрана дастаткова дакументаў, пачалося будаўніцтва сядзібы, якое фінансавала Міністэрства культуры Беларусі. Польская фірма «Будымэкс» змагла аднавіць яе за 14 месяцаў. Два гады супрацоўнікі дома-музея працавалі над новай экспазіцыяй. Шмат у чым ім дапамаглі калегі Варшаўскага літаратурнага музея імя Адама Міцкевіча Войцэх Хмужынскі і Яцэк Хрома, якія сталі частымі гасцямі на Наваградчыне.

З боку Польшчы ў карыстанне музея было прадастаўлена 200 экспанатаў, сярод якіх мэбля канца XVIII — пачатку XIX стагоддзяў. Праўда, у яго фондзе ўжо налічвалася к гэтаму часу больш за 5 тысяч экспанатаў. Экспазіцыя музея цікавая: дзіцячыя і юнацкія гады Адама Міцкевіча, яго вучоба ў Віленскім універсітэце, выгнанне, паэт у Расіі, яго ад'езд за мяжу ў 1829 годзе. Далей яна размешчана ў падземным пераходзе, які злучае галоўны дом і флігель. Там у асноўным праілюстраваны творы Міцкевіча. Наваколіцы Наваградка, замак, возера Свіцязь, камень філарэтаў... — усё гэта бачыў паэт, усё гэта дорага было яго сэрцу.

Сёння дом-музей імя А. Міцкевіча набыў сусветнае значэнне. 12 верасня— яго святочнае адкрыццё, якое павінна перарасці ў свята ўсяго горада. Тым больш, што напярэдадні адкрыты гісторыка-краязнаўчы музей «Наваградак». На гэтым тыдні на Наваградчыне будуць услаўляць беларускага паэта, помнік якому ўзведзены ля муроў замка. Клопат на яго твары, хваляванне за лёс роднай зямлі.

Успамінаюцца радкі з верша Адама Міцкевіча:

Жыві ж ты ў шчасці, наднямонскі
край....
Я ж — сын твой — з простых моў
вянок сплятаю
Твайму працаўніку — касцу і аратаю.

Ганна ЛАГУН.

Фільмы тыдня

● **«НЯМА ДЗЕ СХАВАЦЦА»**
● **«АДПАЧЫНАК ПААСОБКУ»**
● **«ВІВАТ, ГАРДЭМАРЫНЫ!»**
● **«Я НЯМЕЦКІ КАМПАЗІТАР З РАСІІ...» МАНАЛОГ АЛЬФРЭДА ШНІТКЕ»**

Каляровая мастацкая кінастужка «НЯМА ДЗЕ СХАВАЦЦА» створана амерыканскімі кінамайстрамі. Яе паставіў рэжысёр Марыю Азапардзі па сцэнарыю, напісанаму Алексам Рыбарам. Дэтэктыўны сюжэт «крутога» баявіка з элементамі меладрамы напэўна спадабаецца і запомніцца гледачам самых розных узростаў і густаў.

...Аварыі, якія адбываюцца пры выпрабаваннях новых ракет, насцярожваюць спецыялістаў. Пачынаецца расследаванне. Малады афіцэр хутка знаходзіць прычыну — некаторыя дэталі, што пастаўляюцца буйной фірмай, маюць сур'ёзны брак. Дзялкі ваенна-прамысловых колаў імкнуцца замяць гэтую справу, таму што могуць сарвацца шматмільённыя заказы. Неўзабаве афіцэр гіне ў верталётнай аварыі, і абставіны яго смерці вельмі загадкавыя. І тады, помсцячы за мужа, у бітву з карумпіраванымі дзялкамі ўступае жонка афіцэра, адважная жанчына, якая мае дзіця...

У галоўных ролях заняты Джон Колікас, Майкл Айрансайд і іншыя.

***

Кінематаграфісты ЗША прапануюць гледачам яшчэ адну каляровую мастацкую кінакарціну — «АДПАЧЫНАК ПААСОБКУ». Фільм зняты ў жанры камедыі. У яго аснову пакладзена аднайменная аповесць Эрыка Вебера. Аўтар сцэнарыя —Роберт Ваўфман, рэжысёр-пастаноўшчык — Мішэль Андэрсан.

...Героі стужкі, якія ўяўляюць сабой тыповую амерыканскую сям'ю, вельмі стаміліся ад шалёнага тэмпу жыцця, дзяцей, дробных сварак і канфліктаў. Напярэдадні ў іх адпачынак. Як правесці яго? Муж і жонка вырашаюць на гэты раз адпачываць паасобку. Фільм пераносіць нас на цудоўныя бразільскія пляжы і модны высакагорны лыжны курорт... Тут з героямі адбываюцца неверагодныя здарэнні, яны з цяжкасцю выблытваюцца з самых адмысловых сітуацый, і ў канцы свайго бурнага адпачынку прыходзяць да адной вельмі актуальнай думкі...

Фільм надзвычай відовішчны і дорыць гледачам шмат прыемных і вясёлых хвілін. Важную лепту ў яго поспех уносіць цудоўная ігра Дэвіда Ноўтана і Джэніфер Дэйл, якія выконваюць галоўныя ролі.

***

У кінатэатрах і клубах будзе паказвацца таксама новая каляровая мастацкая кінастужка «ВІВАТ, ГАРДЭМАРЫНЫ!» Фільм з'яўляецца працягам кінааповядання аб яркіх і рамантычных прыгодах юных герояў, якія пачаліся ў захапляючай кінакарціне «Гардэмарыны, наперад!» Сцэнарый яго напісалі Ніна Саратокіна, Юрый Нагібін і Святлана Дружыніна, рэжысёр — Святлана Дружыніна. Карціна створана на студыі «Жанр» кінаканцэрна «Масфільм». Сюжэт новага фільма заснаваны на рэальным гістарычным факце — прыездзе ў Расію нявесты наследніка прастола Пятра III — будучай Кацярыны II. У фільме гледачы ўбачаць яе зусім маладзенькай, калі яна была ўсяго толькі Соф'яй Фрэдэрыкай Аўгустай Ангальт-Цэрбсскай, альбо проста Фіке. Імператрыца Лізавета меркавала зрабіць з беднай дзяўчыны толькі марыянетку пры двары. І зноў гледачы могуць мець асалоду ад цудоўнай ігры занятых у карціне любімых акцёраў — Дзмітрыя Харацьяна, Сяргея Жыгунова, Міхаіла Баярскага, Яўгенія Еўсцігнеева, Людмілы Гурчанка, Наталлі Гундаравай і іншых.

Заслугоўвае ўвагі новая каляровая поўнаметражная кінастужка «Я НЯМЕЦКІ КАМПАЗІТАР З РАСІІ...» МАНАЛОГ АЛЬФРЭДА ШНІТКЕ» вытворчасці Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў. Аўтары сцэнарыя — І. Іцкоў, Н. Савіцкі і М. Бабак, рэжысёр — М. Бабак.

Яго бацька— яўрэй, маці родам з паволжскіх немцаў. І таму дзве краіны, Германія і Расія, моцна знітаваны з жыццём і творчасцю кампазітара, якога адносяць да жывых класікаў XX стагоддзя.

НА ЗДЫМКУ: кадр з фільма «Віват, гардэмарыны!»

АБНОВАК ШМАТКОЛЕРНАСЦЬ

Былая брэсцкая швейная фабрыка імя Фаміна стала арэндна-прамыслова-гандлёвай фірмай «Надзея». Змянілася не толькі шыльда, змяніўся ўвесь стыль работы. Распачаты выпуск адзення для дзяўчат і дзяўчынак на ўзроўні еўрапейскіх стандартаў. Пастаянна абнаўляецца асартымент. Калі раней за год прадпрыемства прапаноўвала 110 мадэлей, дык сёлета за паўгода — ужо 171. Сукенкі, касцюмныя камплекты, сарафаны, спадніцы, штаны, халаты, якія выпускае фірма, не залежваюцца на прылаўках. А гэта лепшая ацэнка дзейнасці прадпрыемства.

Асноўная цяжкасць у швейнікаў — недастатковы асартымент тканіны. Забеспячэнцам прадпрыемства даводзіцца нялёгка. Але пакуль што іх пошуку спадарожнічае поспех, аб чым сведчыць шматколернасць выпускаемых вырабаў.

НА ЗДЫМКУ: манекеншчыцы Валянціна МШАР, Алена ШТОНДА і Ірына ДЗЕМЯНЧУК дэманструюць фірменныя мадэлі жаночага адзення.

Фота Эдуарда КАБЯКА. (БЕЛІНФАРМ).

СУБОТНІМ ВЕЧАРАМ

ЯК ГЭТА НАЗЫВАЕЦЦА?

Такое пытанне было зададзена знаўцам матэматыкі 29 жніўня. Вось правільны адказ на яго.

На чарцяжы № 1 — эпіцыклоіда — плоская крывая, якая апісваецца пунктам акружнасці, якая звонку датычыцца нерухомай акружнасці і коціцца па ёй без слізгання.

На чарцяжы № 2 — дадэкаэдр — адзін з пяці тыпаў правільных мнагаграннікаў, мае 12 пяцівугольных граней, 30 робраў, 20 вяршынь, у якіх сходзяцца па тры рабры.

На чарцяжы № 3 — аднаполасны гіпербалоід — незамкнёная паверхня другога парадку, утвораная пры вярчэнні гіпербалы вакол яе ўяўнай восі.

ПЯЦІВУГОЛЬНІК З КВАДРАТА

5 верасня было прапанавана з квадрацікаў, трохвугольнікаў і прамавугольнікаў скласці вялікі пяцівугольнік. Адказ на гэтае пытанне паказаны на чарцяжы.

ГАЛАВАЛОМКА

Калі б вам двайм прапанавалі ўзяць па алоўку і, пачынаючы з клеткі А, «прайсці» да клеткі Б, пабыўшы ў 23 клетках, — як бы вы гэта выканалі? Нагадаем, што праз кожную клетачку можна «прайсці» толькі адзін раз, а шляхі не павінны перасякацца. Чорная клетка ў цэнтры і клеткі А і Б не залічваюцца. Усе лініі павінны быць прамымі.

Гатую галаваломку даслаў мінчанін Рыгор Якуш.



ДА ЎВАГІ ЧЫТАЧОЎ

Рубрыка «Суботнім вечарам» (а раней «Зімовым доўгім вечарам») жыве ўжо некалькі месяцаў. Вакол яе склалася даволі цікавае кола аўтараў. Але ж нам хацелася б, каб і іншыя нашы чытачы больш актыўна ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы «Суботніх вечароў».

РАСЛІНЫ І ЗДАРОЎЕ

Ліпа драбналістая

НАРОДНЫЯ НАЗВЫ: ЛІПА СЭРЦАПАДОБНАЯ, ВЕКАВУХА, ЛІПНЁЎКА, ЛІПНІК.

На Беларусі расце паўсюдна ў шыракалістых лясах, культывуецца як дэкаратыўная, лекавая расліна.

Лістападнае дрэва вышынёю 15—25 м (часам да 40 м). Расце хутка, жыве каля 300—400 гадоў.

Ствол прамы, роўны, буйны, пакрыты маршчыністаю карой. Галіны ствараюць густую, купалападобную крону, пакрытыя цёмна-бурай карой. Маладыя галінкі чырванаватыя, з дробнымі сачыўкамі.

Корань пранікае ў зямлю глыбока, бакавыя разыходзяцца на значную адлегласць.

Лісце на доўгіх чаранках, чарговае, 5—9 см даўжынёй, зверху зялёнае, гладкае, знізу шызаватае, з рыжымі валаскамі, распускаецца пасля цвіцення.

Цвіце ў чэрвені, ліпені. Кветкі пахкія, жаўтавата-белыя, сабраныя па 5—11 у паўпарасоннікі з прырослым прыкветкавым лісцікам, сядзяць на доўгіх кветаножках. Найбольш актыўна цвіце ў 40—60-гадовым узросце.

Плады — шарападобныя арэшкі з белаватым насеннем, нагадваюць міндаль, арэхі. Паспяваюць у жніўні — верасні.

Кветкі багатыя на фітанцыды, вітамін С, у іх ёсць гліказіды, дубільныя рэчывы, цукар, карацін, эфірны алей, які надае кветкам прыемны пах. Плады змяшчаюць да 12 % тлустага алею. У лісцях шмат вітаміну С, карацiну, у кары і драўніне ёсць таніны.

ВЫДАТНЫ МЕДАНОС

У ГАСПАДАРЦЫ выкарыстоўваюць драўніну ліпы. Яна мяккая, лёгкая, добра паддаецца апрацоўцы, паліраванню. Выкарыстоўваецца ў мэблевай прамысловасці, будаўнічай вытворчасці. З яе робяць чарцёжныя дошкі, такарныя вырабы, пратэзы, цацкі, лыжкі, шкатулкі і інш. Ліпавая фанера высока цэніцца ў авіяцыі.

Ад кары аддзяляюць унутраную частку — лыка і луб. Сырое лыка маладых ліп ідзе на выраб мешкавіны, кошыкаў, лапцей, падвязачнага матэрыялу. З больш старога лубу атрымліваюць мачала для вяровак, канатаў, рагож, цыновак, дыванкоў.

Кветкі выкарыстоўваюць у парфумнай прамысловасці для надання паху туалетнаму мылу, зубным пастам, парашкам і інш. Ліпавы вугаль уваходзіць у састаў зубных парашкоў.

Ліпу высаджваюць у парках, уздоўж дарог. У адной кветцы змяшчаецца 12 мг нектару. Ад аднаго вялікага дрэва можна атрымаць да 12 кг мёду — амаль столькі, колькі з 1 гектара грэцкага поля.

ДЛЯ ХАРЧАВАННЯ выкарыстоўваюць ліпавы мёд, лісце, плады. З маладога лісця робяць вітамінныя салаты, напіткі. З пладоў атрымліваюць ліпавы алей, з кветак гатуюць смачны пахкі чай.

Чай ліпавы. Высушаныя суквецці заварыць кіпенем, настойваць 10—15 хвілін.

1 ст. лыжка ліпавых кветак, 400 мл вады, цукар па смаку.

Напітак з лісця ліпы. Лісце заварыць кіпенем, настойваць 30 хвілін, працадзіць. Дадаць цукар, варэнне ці мёд, астудзіць. Піць як асвяжальны напітак, які праганяе смагу.

100—150 г лісця ліпы, 500 мл вады, цукар па смаку.

У НАРОДНАЙ МЕДЫЦЫНЕ шырока выкарыстоўваюць кветкі, пупышкі, кару, мёд ліпы. Яны аказваюць бактэрыцыднае, патагоннае, , болесуцішальнае, мачагоннае, адхарквальнае, супрацьзапаленчае, супрацьсутаргавае, змякчальнае дзеянне.



Настой кветак ліпы. 20 г дробна нарэзаных кветак настойваць у 250 мл кіпеню 30 хвілін, працадзіць. Піць нанач гарачым пры прастудзе, кашлі, паласкаць поласць рота і зева пры ангіне.

Адвар з кветак ліпы. 20 г кветак ліпы варыць у 250 мл кіпеню 10 мінут, працадзіць. Піць гарачым на ноч пры кашлі, прастудзе, балючым мочаспусканні, нервовых захворваннях, сутаргах, болях у жываце. Вугаль з высушанай драўніны піць па 1 чайнай лыжцы з назімным малаком пры туберкулёзе лёгкіх.

Парашок з вугалю прымаць па 1 чайнай лыжцы 3—4 разы на дзень пры успушванні жывата, паносах, адрыжцы.

Плады высушыць, расцерці ў парашок, дадаць воцат. Выкарыстоўваць пры насавых крывацёках (100 г пладоў, 25 мл воцату сталовага).

Парашок з лісця пасыпаюць на раны, болькі для спынення крывацёку.

Камбій атрымліваюць пры саскрабанні ўнутранай часткі кары і драўніны. Ім змазваюць раны, болькі, апёкі.

Дзёгцем з ліпавай драўніны змазваюць скуру пры экземе.

Лісце ліпы загарнуць у марлю, апусціць у кіпень, злёгку астудзіць і прыкладваць да запалёнага гемарою, на балючыя суставы пры рэўматызме.

Супрацьпаказанні не ўстаноўлены.

НАРЫХТОЎВАЮЦЬ кветкі, пупышкі, кару ліпы. Ліпа цвіце 10—15 дзён у чэрвені-ліпені. У гэты час асобныя кветкі знаходзяцца ў стадыі бутанізацыі, але большая частка ўжо распусціліся.

У сухое надвор'е абрываюць цэлыя суквецці, рассыпаюць тонкім слоем на чыстыя пасцілкі, сушаць у засені, у памяшканнях, якія добра праветрываюцца, у сушылках — пры тэмпературы не вышэй 25—30 градусаў С. На сонцы сушыць нельга, сыравіна губляе колер і гаючасць.

Пупышкі збіраюць вясной, сушаць на адкрытым паветры, у сушылках. У сырое, дажджлівае надвор'е пупышкі і кветкі збіраць нельга — пры сушцы яны губляюць карысныя ўласцівасці.

Кару можна збіраць толькі з дазволу лясніцтва ці садаводаў ранняй вясной (да цвіцення) ці позняй восенню. Сушыць у сушылках.

Збор сыравіны праводзяць з дрэваў, удалечыні ад дарог, незапыленых, не забруджаных вытворчымі адходамі.

Тэрмін захоўвання кветак і пупышак 2 гады, кары — 3 гады.

Ніна АЛЯКСЕЙЧЫК,
Валер САНЬКО.

ПРАДАЮ

шчанят дога (з дакументамі).

Тэл. у Мінску 42-22-53.

КРЫЖАВАНКА «ЗАГАДКІ»

Загадкі, якія Віктар СУХАРАЎ з г. п. Бялынічы выкарыстаў у сваёй крыжаванцы, змешчаны ў кніжцы А. Гурскага «Загадкі».

ПА ГАРЫЗАНТАЛЯХ: 5. Ног многа, але да хаты на спіне едзе. 6. Маці з локаць, бацька з сажань, а дзеткі па пальцу. 8. Расло, паўырасла, з куста вылезла, на руках пакацілася, на зубах раскусілася. 9. Па тканым моры жалезны карабель плыве, мора пад ім шуміць і высыхае. 11. Рассыпаўся гарох на сто дарог, ніхто не падбярэ — ні цар, ні царыца, ні красная дзяўіца. 12. Не шкадуюць мяне — мнуць, у печку гарачую кладуць, а як вымуць, дык яшчэ нажом рэжуць за сталом. 13. Вечарам нараджаецца, ноч жыве, а раніцою памірае. 17. Маленькі, гарбаценькі, усё поле абляжыць, а к вечару дамоў прыбяжыць. 18. З барадою — а не дзед, з рагамі — а не бык, лыкі дзярэ, але лапці не пляце. 19. Тоненькі, на скуры расце, прыгажосць чалавеку надае. 21. Без сякеры і цвікоў збудаваны круглы дом. 22. Сам худы, а галава з пуд.

ПА ВЕРТЫКАЛЯХ: 1. Кінеш на камень — не разаб'ецца, кінеш на ваду — расплывецца. 2. Шуба белая ўвесь свет адзела. 3. Як гаршчочак разаб'еш, дык і кашку з'еш. 4. Ляжыць паленца, а ў сярэдзіне сарца. 7. Стукае, грукае, а нідзе яго не відаць. 10. Усім цёпла —яму сцюдзёна, а ўсім сцюдзёна— яму цёпла. 11. У стаўку купаўся ды сухім застаўся і пайшоў, гарласты, у чырвоных ластах. 14. Не яздок, а са шпорамі, не вартаўнік, а ўсіх будзіць. 15. Зубы вострыя мае, дробна жуе, а не глытае. 16. Адгадайце, што за лекар у лесе — жыве спрадвеку, лечыць летам і зімой дзюбаю сваёй. 19. Як снег растане — зашуміць, а як лёд стане — замаўчыць. 20. У паветры лунае, наперадзе ідзе і людзей за сабой вядзе.

АДКАЗЫ НА КРЫЖАВАНКУ, ЗМЕШЧАНУЮ 5 ВЕРАСНЯ



НАДВОР'Е

12 верасня

Сёння ўдзень па рэспубліцы захаваецца халаднаватае надвор'е, пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ў Віцебску 14—16, Магілёве—15—17, Мінску, Гомелі—16—18, Гродна—18—20, Брэсце—19—21 градус цяпла.

У наступныя двое сутак пераважна без ападкаў, толькі 14 верасня месцамі ў асноўным па поўначы пройдуць невялікія дажджы. Тэмпература паветра ўначы 3—8, удзень 15—20 градусаў цяпла.

Л. САНКЕВІЧ,
інжынер-сіноптык.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

12 верасня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.40. «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана». Маст. фільм «XX стагоддзе пачынаецца». 1-я серыя
10.00. Паказвае Гомель. Інфармацыйна-публіцыстычная праграма.
11.00. Тыдзень планеты.
11.15. Дак. фільм «На сямі ўзгорках» (Смаленск).
11.45. Кікбоксінг. Міжнародны турнір у Маскве.
12.15. М. Булгакаў. «Звар'яцелы Журдэн». Спектакль Дзяржаўнага тэатра імя В. Камісаржэўскай. 1-я дзея.
13.15. «Сігма-92». Фестываль бальных танцаў.
14.15. «Паходня і балерына». Мультфільм.
14.25. М. Булгакаў «Звар'яцелы Журдэн». 2-я дзея.
15.20. Ало! Ёсць пытанне. Аб забеспячэнні насельніцтва лекамі расказвае генеральны дырэктар ВА «Белфармацыя» В. П. Гаранькоў. Прамая лінія.
16.20. Песню бярыце з сабою. 1-е аддзяленне.
17.35. Працістаянне. Маральна-прававая праграма.
18.20. Песню бярыце з сабою. 2-е аддзяленне.
19.35. Адраджэнне. «Пад знакам Пагоні», «Вянок цярновы вясельковы», «Часцінка».
20.40. Калыханка.
21.00. Панарама.
21.25. Тэлебіржа.
21.35. «Сінема» прадстаўляе маст. фільм «Yesterday» («Учора») (Польшча).
23.05. Бізнес-клуб «Партнёр» прапануе... Дабрачынны тэлеаўкцыён.
23.10. НІКа.

Канал «Астанкіна»

6.00. Навіны.
6.20. Ранішняя гімнастыка.
6.30. Суботняя раніца дзелавога чалавека.
7.30. Спорт-шанц.
8.00. Як дабіцца поспеху.
8.15. «Марафон-15» — малышам.
8.40. Бумеранг.
9.10. Радыё «Труба».
9.40. Медыцына для цябе.
10.20. «Брава».
11.20. Экалагічная хроніка.
11.40. Праграма тэлебачання Японіі. «Цела чалавека: нараджэнне новага жыцця».
12.35. На III Міжнародным фестывалі тэлепраграм для дзяцей і юнацтва.
12.55. «Другая рэчаіснасць». Фільм 2-гі «Астравы».
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.25. Маст. фільм «Кубанскія казакі».
16.40. «Чырвоны квадрат».
17.20. У свеце жывёл.
18.00. «Яноты». Мультфільм (Канада). 4-я серыя.
18.25. «Атэль «Ля загінуўшага альпініста». Маст. фільм.
19.45. Добрай ночы, малышы!
20.00. Навіны.
20.40. Брэйн-рынг.
21.40. «Гэты танец агнявы».
22.35. Аўтаралі «Парыж—Масква—Пекін».
23.00. Навіны.
23.20. «Не дапеўшы куплета». Памяці Ігара Талькова.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Дарога да храма. «У імя Ўваскрэсення».
8.00. Свет спорту вачамі фірмы «Жылет».
8.30. Праграма «03».
9.00. Адкрыты чэмпіянат ЗША па тэнісу.
10.00. Відэаканал «Плюс адзінаццаць».
11.15. «Як жыць будзем?»
12.00. Пілігрым.
12.45. «Паўднёвыя Курылы. У чым праблема?» Вядучы — У. Цветаў.
13.00. Весткі.
13.25. «Выкраданне чарадзея». Маст. фільм.
15.05. «Бурда модэн» прапануе...
15.35. «Праўда і міфы пра вадародную бомбу».
16.35. Вінілавыя джунглі.
17.05. Парламенцкі веснік.
17.20. «У пошуках жанру». Леанід Філатаў.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Маскі-шоу.
20.00. «Ханусен». Маст. фільм (Венгрыя—ФРГ).
22.00. Весткі.
22.20. Канцэрт аркестра «Токіо Ска Парадайз» (Японія).
23.05. Адкрыты чэмпіянат ЗША па тэнісу.

13 верасня

Беларускае тэлебачанне

8.30. Раніца рэспублікі.
8.45. «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана». Маст. фільм «XX стагоддзе пачынаецца». 2-я серыя.
10.00. «Цёплыя камяні восені». Кінанарыс.
10.15. Урокі здароўя. Загартоўка і аздараўленне прыроднымі фактарамі.
10.45. Вас выклікае Спартландыя.
11.50. Асілак. Прамая лінія.
12.40. «Маладосць мая незабыўная...» Расказвае Э. Бравярская.
13.30. «Паляванне на адзінарога». Маст. фільм з субцітрамі.
14.45. «Мая душа, як ястраб дзікі...» Па аповесці П. Ламана «Купалінка».
15.45. Пра шахматы і шахматыстаў. Вядучая — міжнародны гросмайстар К. А. Зварыкіна.
16.15. «Піліпок». «Дамок для ўсіх». Мультфільмы.
16.40. Трэці тайм.
17.25. «Еднасць пачуццяў». Дабрачынны вечар «Жывапіс і музыка» ў Дзяржаўным мастацкім музеі Беларусі.
18.25. Запрашаем на вячоркі. Фальклорны калектыў «Крынічка» вёскі Трабы Іўеўскага раёна.
19.25. З пакядзелка... Як уберагчыся ад жыццёвых стрэсаў.
20.00. Панарама.
20.25. Кароткаметражны фільм «Пёс Барбос і незвычайны крос».
20.40. Калыханка.
21.00. «Сінема» прадстаўляе: маст. фільм «Каруначніца» (Францыя).
22.30. Бізнес-клуб «Партнёр» прапануе... дабрачынны тэлеаўкцыён.
22.35. Вечарынка аўтарскай песні.

Канал «Астанкіна»

6.00. Гадзіна сілы духу.
7.00. Тыраж «Спортлато».
7.15. «Аранжавае горлачка». Мультфільм.
7.35. Канцэрт фальклорных калектываў Балгарыі.
8.05. Мультфільм «Прыгоды сям'і Глэдл» (Францыя).
8.35. «Яблыкі на снезе» (Японія).
9.05. Магчыма ўсё.
9.35. Ранішняя зорка.
10.25. Гэта вы можаце.
11.05. Сустрэча ў Канцэртнай студыі Астанкіна з пісьменнікам Э. Лімонавым.
12.05. «Марафон-15».
13.00. «Метамарфозы жывапісу». 5-я і 6-я серыі. «Тэхніка і форма».
14.00. Навіны (з сурдаперакладам).
14.20. Дыялог у прамым эфіры.
15.00. Клуб падарожнікаў.
15.50. Панарама.
16.30. Тэлелоцыя.
16.45. Уолт Дысней прадстаўляе...
17.45. Навіны.
18.00. «Цунамі». Вядучы — М. Задорнаў.
19.00. Навіны кіно.
19.35. Маст. фільм «Хлопчыкі».
21.00. Вынікі.
21.45. Спартыўны ўік-энд.
22.00. Манро і Мадонна.
23.00. Навіны.
23.25. Відэадром.
23.55. «Мюнхгаўзен-клуб». Забаўляльная праграма.

Канал «Расія»

7.00. Весткі.
7.20. Крыніцы.
8.00. Хочаце, верце...
8.30. Адкрыты чэмпіянат ЗША па тэнісу.
10.00. «Прыгода ў каралеўстве». Мультфільм. 3-я серыя.
10.25. Аты-баты...
10.55. «Урокі космасу».
11.55. Расійская Энцыклапедыя. «З таго свету».
13.00. Вескі.
13.20. Мультфільм «Дараэмон» (Японія). 1-я і 2-я серыі.
13.55. Рускія песні і рамансы.
14.40. Л. Панцялееў. «Веруюь».
15.45. Аўтагонкі. Гран-пры «Формула-1». Трансляцыя з Італіі.
18.15. Конкурс бальных танцаў. Лацінаамерыканская праграма.
19.00. Весткі.
19.20. Свята кожны дзень.
19.30. Спартыўная праграма.
19.55. Клуб «Жоўтая падводная лодка».
20.25. «Ночы Дакамерона». Маст. фільм.
22.00. Вескі.
22.20. Спартыўная карусель.
22.30. Начны акцёрскі клуб. «Крос».

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь,
калектыў рэдакцыі газеты «Звязда».

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: У. АНДРЫЕВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), І. БАРАНОЎСКІ, У. ГОЙТАН, В. ЖДАНКО, Л. ЛАХМАНЕНКА, М. МІХАЕВІЧ (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. МЯСНІКОЎ, Л. РЫЖАНКОВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. ЦІХАНОВІЧ, С. ШАЎЦОЎ.

НАШ АДРАС: 220041, гор. Мінск, праспект Ф. Скарыны, 77, рэдакцыя газеты «Звязда». ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 32-51-05, аддзела пісьмаў — 32-04-52, 32-41-92, навін —32-60-13, даведкі па рэкламе і аб'явах — 32-35-91.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі.

Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з чытачамі.

Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Тыраж 81.098. Індэкс 63.850.
Зак. № 184.
Выходзіць 250 разоў на год.
Нумар падпісаны ў 21.00.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12